ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 8 (2277)
28 студзеня 1969 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

МУЗЕЙНАЯ цішыня...
Здаецца ў самім паветры разліта невымерная пашана і святасць...

Ці ўслухоўваліся вы ў гэтую своеасаблівую цішыню! Ледзь улоўны шоргат ног, часам прыглушаная скарагаворка экскурсаводаў — нібы лёгкі вецер на азёрнай гладзі — і зноў таінства маўклівай, сам-насам, размовы чалавека з рэччу...

Такія ўжо гэта культурна-асветныя ўстановы — музеі, такая ў іх спецыфіка работы. Яна вымагае актыўнасці перш за ўсё самога гледача. Работнікі лепшых музеяў і імкнуцца дапамагчы гледачу ўбачыць як мага больш — нястомным вышукваннем усё новых матэрыялаў, падборам найбольш значных і выразных экспанатаў, якія гаварылі б самі за сябе. І яшчэ — сістэмай, методыкай іх падачы, усім стылем мастацкага афармлення экспазіцый. І яшчэ — дыферэнцыяваным падыходам да наведвальнікаў. Экскурсаводы лепшых музеяў — гэта людзі творчай працы, чулыя і вопытныя педагогі.

Але мы памыліліся б, калі б меркавалі аб рабоце таго ці іншага музея толькі па тым, што на відавоку, як нельга ўяўляць аб велічыні айсберга толькі па яго надводнай частцы. Музейная цішыня — падманлівая...

НАДЗЁННАЕ, неадкладнае

МУЗЕЙНЫЯ СКАРБЫ— НАРОДУ

Работнікі лепшых музеяў не абмяжоўваюцца толькі сценамі сваёй установы. Яны чытаюць лекцыі на прадпрыемствах, ва ўстановах, калгасах і школах, наладжваюць сустрэчы працоўных і навучэнцаў з ветэранамі рэвалюцыі, войнаў, мірнай працы, удзельнікамі і відавочцамі памятных падзей, дэманструюць перасоўныя выстаўкі, праводзяць экскурсіі па памятных месцах, выдаюць розныя буклеты і да т. п.

Тры гады — з канца 1964 па 1968 — ішоў Усесаюзны грамадскі агляд музеяў, прысвечаны 50-годдзю Вялікага Кастрычніка. Гэтыя гады з'явіліся часам вялікага ўздыму музейнай работы. Чуйна была ўлоўлена адна выдатная тэндэнцыя нашага часу — незвычайны рост цікавасці да гісторыі роднага краю, да гераічнага яе мінулага, росквіт следапытніцкага руху пад высакародным дэвізам «Ніхто не забыты, нішто не забыта». У гарадах і вёсках, у школах і на прадпрыемствах узніклі сотні новых народных музеяў і краязнаўчых куткоў — плён працы тысяч энтузіястаў.

Зараз у Беларусі налічваецца 47 дзяржаўных музеяў, 343 музеі, якія працуюць на грамадскіх пачатках, і звыш сямі тысяч пакояў і ленінскіх куткоў, куткоў рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы, краязнаўчых куткоў. Аб накопленым імі вопыце работы можна было б многа расказваць.

Расказваць аб тым, як нібы нанова нарадзіўся і стаў першакласнай культурна-асветнай установай Магілёўскі абласны краязнаўчы музей, хоць яму споўнілася ўжо 100 гадоў; як самаддана і любоўна збіралі і апрацоўвалі кожны экспанат работнікі музея Ф. Э. Дзяржынскага ў Івянцы, музея «жалезнага Фелікса», паплечніка Ільіча, палымянага ленінца; як незвычайна пашырылі поле дзейнасці супрацоўнікі аршанскага музея К. С. Заслонава, паслаўшы толькі за адзін год 66 перасоўных выставак на прадпрыемствы і ў калгасы, арганізаваўшы масавы выезд былых партызан і моладзі ў вёску Купаваць Сенненскага раёна на месца гібелі легендарнага «Дзядзі Косці», музея, няштатнымі супрацоўнікамі якога, экскурсаводамі-кіраўнікамі турысцкіх паходаў моладзі па месцах баявых дзеянняў партызан сталі былыя заслонаўцы А. Арцішук, А. Бухавец, А. Коржань, І. Зацюпа і іншыя; як рэспубліканскую славу здабыў народны ленінскі музей Буда-Кашалёўскай школы № 1, экспанатам якога і стэндам, прысвечаным землякам, узнагароджаным ордэнам Леніна, калгасу імя Леніна, першым камсамольцам і піянерам раёна, першай сялянскай камуне, мог бы пазайздросціць любы раённы ці міжраённы дзяржаўны музей...

Так, павучыцца ёсць у каго, вопыту за час мінулага агляду накоплена нямала. Гэты вопыт павінен быць абагульнены, шырока распаўсюджаны і ўзбагачаны ў час правядзення ў 1969—1970 гадах новага Ўсесаюзнага агляду работы музеяў, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.

Міністэрства культуры БССР і Прэзідыум Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў культуры прынялі пастанову «Аб удзеле музеяў рэспублікі ва Ўсесаюзным аглядзе работы музеяў, прысвечаным 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна». Поспех новага агляду, мэта якога — актывізаваць работу музейных устаноў па камуністычным выхаванні працоўных, асабліва моладзі, можа быць дасягнуты толькі тады, калі ў актыўную работу будуць уключаны не толькі штатныя супрацоўнікі музеяў, але і няштатныя. На прыкладзе Аршанскага музея К. С. Заслонава можна бачыць, якую неацэнную дапамогу здольна аказаць грамадскасць.

Трэба, каб кожны музей, з улікам свайго профілю і спецыфікі, у першую чаргу, палепшыў паказ гістарычнай ролі У. І. Леніна як стваральніка партыі і першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы, ярка і пераканаўча раскрыў увасабленне ленінскіх ідэй у сацыялістычным і камуністычным будаўніцтве, доказна і выразна адлюстраваў дасягненні савецкага народа пад кіраўніцтвам КПСС ва ўсіх галінах эканомікі, навукі, культуры, камуністычнага выхавання працоўных.

На новую, яшчэ больш высокую ступень павінны ўзняцца навукова-даследчая работа, камплектаванне фондаў, масава-асветная дзейнасць. Спецыяльныя экскурсіі, лекцыі, гутаркі ля музейных стэндаў і на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах аб жыцці і дзейнасці У. І. Леніна, арганізацыя стацыянарных і перасоўных выставак аб правадыры — вось няпоўны пералік тых форм і метадаў работы, якія павінны атрымаць далейшае развіццё.

Справа гонару дзяржаўных музеяў працягнуць руку дапамогі сваім «малодшым братам» — народным музеям. Колькасць гэтых музеяў павінна няспынна расці, а работа ў іх паляпшацца, уздымацца на навукова-метадычны ўзровень. Работнікі дзяржаўных музеяў павінны ўзяць на ўлік усе каштоўныя матэрыялы ў гэтых грамадскіх музеях і кутках.

Кожны дзень гасцінна расчыняюцца перад наведвальнікамі дзверы нашых музеяў. І трэба зрабіць усё, каб за час агляду, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, паток людзей няспынна павялічваўся, каб гэтыя асяродкі культуры, асветы і выхавання працавалі з поўнай аддачай.



ПАД ЗНАКАМ ЛЕНІНСКАГА ЮБІЛЕЮ

ПЛАН РАБОТЫ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ НА 1969 ГОД. КАМЕНЦІРУЕ САКРАТАР ПРАЎЛЕННЯ І. ШАМЯКІН

Днямі адбылося першае ў гэтым годзе пасяджэнне прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. На пасяджэнні быў абмеркаваны і зацверджаны план асноўных мерапрыемстваў, што будуць праведзены сёлета пісьменніцкай арганізацыяй рэспублікі. Наш карэспандэнт звярнуўся да другога сакратара праўлення Саюза пісьменнікаў І. Шамякіна з просьбай пракаменціраваць гэты план.

— Жыццё, вядома, будзе ўносіць пэўныя карэктывы ў намечаны план нашай работы, — сказаў І. Шамякін. — Таму ўвагу чытачоў газеты «Літаратура і мастацтва» хочацца запыніць толькі на некаторых, найбольш важных і характэрных пунктах плана.

Сёлетні год для савецкага народа, як вядома, праходзіць пад знакам падрыхтоўкі да ленінскага юбілею. Натуральна, што пры распрацоўцы плана асноўных мерапрыемстваў арганізацыйна-творчай работы пісьменніцкай арганізацыі мы зыходзілі перш-наперш з гэтага.

Галоўны клопат і абавязак прэзідыума і сакратарыята — спрыяць таму, каб пісьменнікі Савецкай Беларусі сустрэлі 100-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча новымі творчымі здабыткамі, перш за ўсё творамі пра Леніна і партыю, творамі на актуальныя тэмы камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Мы будзем садзейнічаць пісьменнікам у зборы матэрыялаў і напісанні такіх твораў. У плане нашай работы так і запісана: «Праз Усесаюзнае бюро прапаганды літаратуры наладзіць паездкі пісьменнікаў па ленінскіх мясцінах». У другім пункце плана гаворыцца: «Забяспечыць паездкі па творчых камандзіроўках перш за ўсё для тых пісьменнікаў, якія працуюць над творамі на ленінскую тэматыку, а таксама над тэмамі з сённяшняга жыцця нашага народа. На пасяджэннях сакратарыята заслухоўваць справаздачы аб выніках паездак у творчыя камандзіроўкі».

Думаецца, што гэтыя пункты плана не патрабуюць дадатковага каментарыя.

Сёлета, як, дарэчы, і летась, мы будзем шырока выкарыстоўваць такую форму кантактаў з чытачамі, як паездкі пісьменнікаў па гарадах і вёсках рэспублікі з выступленнямі перад працоўнымі. У часе гэтых сустрэч з рабочымі і калгаснікамі, школьнікамі і студэнтамі пісьменнікі раскажуць пра сённяшні стан беларускай савецкай літаратуры, пра яе поспехі і здабыткі, пра тое, які ўклад нашых літаратараў у мастацкую Ленініяну, як яны сёння працуюць над ленінскай тэмай, падзеляцца сваімі творчымі планамі і задумамі, прачытаюць свае творы.

Плануем мы правесці недзе вясною пашыранае пасяджэнне прэзідыума, на якое запросім беларускіх кампазітараў. На гэтым пасяджэнні мы разам абмяркуем арганізацыйныя і творчыя пытанні больш цеснага супрацоўніцтва паэтаў і кампазітараў у стварэнні песень пра Леніна, партыю і Радзіму. Спадзяёмся, што такая сустрэча прынясе пэўны плён.

У маі мяркуем правесці творчую сустрэчу па пытаннях тэатральнага мастацтва. Сумесна з прадстаўнікамі Міністэрства культуры рэспублікі і вядучымі майстрамі сцэны мы думаем пагаварыць аб спектаклях юбілейных гадоў, аб задачах беларускіх драматургаў і тэатраў напярэдадні 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Думаецца, што і гэта сустрэча прынясе карысць, што яна добратворча паўплывае на работу нашых тэатраў і актывізуе нашых драматургаў.

На адным з пасяджэнняў прэзідыума гаворка пойдзе аб тым, як працуюць нашы часопісы «Полымя», «Маладосць», «Неман» і «Беларусь» у сёлетнім юбілейным годзе, якое месца на іх старонках займае ленінская тэматыка, з чым ідуць яны да юбілею.

Сумесна з Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору і Інстытутам літаратуры Акадэміі навук плануем правесці навукова-тэарэтычную канферэнцыю на тэму «Вобраз Леніна ў беларускай літаратуры і мастацтве».

А ў другой палове года правядзём пленум праўлення Саюза пісьменнікаў. На парадку дня пленума — «Ленінская тэарэтычная спадчына і задачы беларускай літаратуразнаўчай навукі і крытыкі». Зазначу, дарэчы, што мы ўпершыню прысвячаем пленум пытанням сучаснага стану і развіцця нашай крытыкі і літаратуразнаўства. Мы спадзяёмся, што на гэтым пленуме пойдзе шырокая гаворка аб значэнні ленінскай тэарэтычнай спадчыны для развіцця літаратуры і мастацтва сацыялістычнага рэалізму, аб тым, як савецкая літаратуразнаўчая навука і крытыка выкарыстоўвае прынцыпы марксісцка-ленінскай эстэтыкі пры аналізе літаратурнага працэсу, аб дзейснасці, аператыўнасці і прынцыповасці нашай крытыкі, аб яе пазіцыях у ідэалагічнай барацьбе на сучасным этапе, аб вернасці літаратуры ленінскім прынцыпам партыйнасці і народнасці сацыялістычнага мастацтва.

Што яшчэ? Пад знакам падрыхтоўкі да ленінскага юбілею мяркуем правесці сёлета тыдні дзіцячай і маладзёжнай кнігі. Мэта іх — прапаганда і папулярызацыя сярод школьнікаў і моладзі кніг пра Леніна, партыю, пра слаўныя справы савецкай моладзі.

Да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча ў выдавецтве «Беларусь» выйдзе зборнік лепшых твораў беларускай мастацкай Ленініяны.

З іншых запланаваных мерапрыемстваў назаву наступныя.

На бліжэйшы час намечана пасяджэнне прэзідыума праўлення на тэму «Пісьменнік і кіно». Маецца на ўвазе, што ў гэтай гаворцы прымуць удзел і беларускія кінематаграфісты. Нам ёсць аб чым пагаварыць, што абмеркаваць, пра што параіцца. Студыя «Беларусьфільм» за апошнія гады набірае тэмпы, павялічвае выпуск фільмаў. Але ці многае з таго, што яна выпускае на экран, запомнілася, парадавала гледачоў? На жаль, вельмі нямногае. І, відаць, для ўсіх нас не сакрэт, што адна з галоўных прычын нізкай якасці шэрагу фільмаў нашай студыі — у слабасці кінасцэнарыяў, у адставанні нацыянальнай кінадраматургіі. Праблема гэтая вострая і пагаварыць аб ёй трэба. Канечне, адна такая гаворка не можа вырашыць усіх набалелых пытанняў, аднак такая гаворка — а гаварыць трэба перш за ўсё пра тое, што перашкаджае беларускай кінадраматургіі стаць на ўзровень патрабаванняў часу — будзе ўсё ж карысная. І для пісьменнікаў, і для кінематаграфістаў.

У свой час на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» была праведзена дыскусія аб дзіцячай літаратуры. Пасля адбыўся пленум праўлення, прысвечаны гэтай тэме. Аднак пытанні развіцця літаратуры для дзяцей не здымаюцца з парадку дня. Таму плануем прысвяціць дзіцячай літаратуры пасяджэнне прэзідыума, на якое запросім прадстаўнікоў Міністэрства асветы, Камітэта па друку і рэдсавета выдавецтва «Беларусь».

Наспела неабходнасць пагаварыць і пра сучасны стан нашага апавядання. Па вопыту былых такога роду размоў мы ведаем, што яны асабліва плённымі бываюць тады, калі ім папярэднічаюць творчыя дыскусіі на старонках друку. Мы спадзяёмся, што і гаворцы пра сучаснае апавяданне будзе папярэднічаць абмен думкамі ў газеце «Літаратура і мастацтва». Пасля гэтаму пытанню будзе прысвечана пасяджэнне прэзідыума пры ўдзеле секцыі прозы, секцыі крытыкі і літаратуразнаўства Саюза пісьменнікаў і рэдкалегіі газеты «Літаратура і мастацтва».

Адно з пасяджэнняў прэзідыума будзе мець такі парадак дня: «Мастацкі пераклад і міжнародныя сувязі беларускай літаратуры». Гэтая тэма таксама падказана жыццём. У апошнія гады беларуская літаратура сягнула шырока ў свет. З другога боку, беларускія пісьменнікі шмат зрабілі для азнаямлення нашага чытача з літаратурай братніх савецкіх рэспублік і краін свету. Мы сёння маем цесныя, сяброўскія сувязі з многімі літаратурамі. Тым не менш, у гэтым кірунку яшчэ трэба шмат зрабіць. Пра гэта і пойдзе гаворка на пасяджэнні.

Плануем мы таксама правядзенне літаратурных вечароў з удзелам пісьменнікаў Расійскай Федэрацыі, вечароў літоўскай літаратуры на Гродзеншчыне, думаем арганізаваць абменныя паездкі групы ўкраінскіх пісьменнікаў па Беларусі, а беларускіх — па Украіне.

У планах работы прэзідыума — справаздачы аб творчай і арганізацыйна-масавай рабоце Гомельскага, Магілёўскага і Гродзенскага абласных аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Беларусі, рэспубліканскі семінар маладых пісьменнікаў, аўтарскія літаратурныя вечары.

І апошняе. Сёлета ўпершыню думаем правесці «Свята першай кнігі». Калі мы гаварылі пра гэта на пасяджэнні прэзідыума, то мелі на ўвазе, што гэта будзе свята аўтараў першых кніжак, своеасаблівае пасвячэнне маладых пісьменнікаў у літаратуру, свята, якое стане традыцыйным.

Увесь савецкі народ вырашыў азнаменаваць сёлетні год новымі выдатнымі працоўнымі дасягненнямі, стаць на ўдарную ленінскую вахту. Мы, пісьменнікі Савецкай Беларусі, таксама не пашкадуем сіл, каб унесці дастойны ўклад да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, будзем з высокім натхненнем і настойлівасцю ствараць новыя яркія творы, несці сацыялістычную культуру ў масы, дапамагаць выхоўваць падрастаючае пакаленне ў духу камунізма.

РАСЦЁМ!

І зноў — лічбы, якіх мы заўсёды з вялікай цікавасцю чакаем.

Лічбы, якія выклікаюць гонар у сэрцах савецкіх людзей.

Лічбы нашага няўхільнага росту — лічбы выканання гадавога плана.

Учытайцеся ў сам урачысты пачатак апублікаванага ў друку паведамлення ЦСУ СССР «Аб выніках выканання Дзяржаўнага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР у 1968 годзе».

«Народная гаспадарка Савецкага Саюза ў 1968 годзе працягвала развівацца высокімі тэмпамі.

Працоўныя нашай краіны, разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, дасягнулі ў 1968 годзе — трэцім годзе пяцігодкі — новых поспехаў у развіцці эканомікі, навукі і культуры і ва ўздыме народнага дабрабыту».

Якое пачуццё годнасці, якая спакойная ўпэўненасць у гэтых простых, скупых на эмоцыі словах! І следам ідуць лічбы, якія навочна паказваюць, адкуль яны — гэтае пачуццё годнасці, гэтая ўпэўненасць.

Нацыянальны даход, скарыстаны на спажыванне і накапленне, складае ў адносінах да папярэдняга, 1967 года, 107,2 працэнта.

Прадукцыя прамысловасці — 108,1 працэнта.


Прадукцыя сельскай гаспадаркі — 103,5 працэнта.

Рэальныя даходы працоўных на душу насельніцтва — 106,1 працэнта.

Вось так і расцём. Няўхільна, упэўнена, усебакова.

Прыемна, што наша рэспубліка па развіцці прамысловасці ідзе па выніках мінулага года ў ліку перадавых. Выкананне плана рэалізацыі прадукцыі і тэмпаў росту прамысловасці за мінулы год складае ў Беларусі 103 працэнты, а ў адносінах да 1967 года — 112 працэнтаў. Добра папрацавала Беларусь у сваім юбілейным годзе!

Лічбы, апублікаваныя Цэнтральным статыстычным упраўленнем СССР, уражваюць, пераконваюць, натхняюць.



Я ЗНАЮ, ГОРАД БУДЗЕ.

Фотаэцюд К. ЯКУБОВІЧА.

СПЕЦЫЯЛІСТАМ І ЎСІМ

Расказвае дырэктар выдавецтва «Навука і тэхніка»
Ф. САВІЦКІ

Наша выдавецтва выпускае навуковую і тэхнічную літаратуру, падрыхтаваную ў інстытутах Акадэміі навук БССР, а таксама ў іншых навукова-даследчых і вышэйшых навучальных установах рэспублікі. Мы выдаём кнігі па фізіка-тэхнічных, хімічных, матэматычных, біялагічных, грамадскіх навуках, кнігі па гісторыі БССР, мастацтвазнаўстве, даследаванні і манаграфіі па ўсіх галінах навукі, тэхнікі, эканомікі, культуры і літаратуры, тэматычныя зборнікі навуковых прац і масавую навукова-папулярную літаратуру. Акрамя гэтага, выдавецтва выпускае 7 серый «Весцяў АН БССР», «Даклады АН БССР» і 3 усесаюзныя навуковыя часопісы.

Усяго сёлета нашы чытачы атрымаюць каля 2800 уліковавыдавецкіх аркушаў кніжнай і часопіснай прадукцыі.

Чытачам газеты «Літаратура і мастацтва» найбольш цікава, пэўна, ведаць, якія кнігі будуць выпушчаны нашым выдавецтвам у гэтым годзе па гісторыі, філасофіі, мове, літаратуры і мастацтве. Назаву некаторыя з іх.

Неўзабаве выйдзе з друку кніга А. Залескага «У тыле ворага (Барацьба савецкага сялянства супраць сацыяльна-эканамічных мерапрыемстваў нямецка-фашысцкіх акупантаў)». У гэтай кнізе ўпершыню ўсебакова расказваецца аб барацьбе сялянства супраць аграрнай палітыкі акупантаў, за захаванне сацыялістычных традыцый у вёсцы, паказваецца побыт савецкіх людзей на часова акупіраванай тэрыторыі.

Навуковых работнікаў, выкладчыкаў, студэнтаў, прапагандыстаў зацікавяць, думаецца, такія кнігі, як «Ідэалагічная работа КПБ у перыяд стварэння падмурку сацыялізма» І. Кавалёва, «Сяляне Беларусі (другая палова XVII—XVIII ст. ст.)» П. Казлоўскага, «Нарысы гісторыі беларускай нацыі» Я. Карнейчыка, «Культура і сацыяльны прагрэс» А. Галаўнёва, «Дыялектыка пераходу да камунізма» В. Горбача, «Дыялектыка рэвалюцыйнага працэсу» Л. Яўменава, «Асоба, свабода, права» В. Кучынскага, а таксама такія калектыўныя працы, як «Рост матэрыяльнага дабрабыту і культуры беларускага народа», «Структура савецкай інтэлігенцыі (па матэрыялах БССР)», «Баптызм і баптысты» і інш.

Тут жа варта назваць і кнігу А. Ракава «Насельніцтва БССР» — навукова-папулярны нарыс аб складзе, колькасці і тэрытарыяльным размяшчэнні насельніцтва Беларусі, аб яго ўзроставых, нацыянальных і вытворча-прафесіянальных характарыстыках.

Кнігі па мове, літаратуры і мастацтве складаюць, бадай, самы важкі раздзел нашага тэматычнага плана сёлетняга года, як, дарэчы, і ў мінулыя гады. Што канкрэтна мяркуем мы выпусціць у свет?

У гэтым годзе павінен, нарэшце, пабачыць свет «Краёвы слоўнік усходняй Магілёўшчыны» І. Бялькевіча. Слоўнік гэты — унікальны, бадай, выключны па паўнаце і карпатлівасці распрацоўкі лексічнага складу гаворак усходняй Магілёўшчыны. Матэрыял, сабраны ў ім, будзе каштоўнай крыніцай як пры вывучэнні тых ці іншых з'яў беларускай мовы, так і пры вытлумачэнні адносін і сувязей рускай, украінскай і беларускай моў.

Выходзяць сёлета таксама «Руска-беларускі слоўнік грамадска-палітычнай тэрміналогіі», падрыхтаваны групай аўтараў, і «Народная сінаніміка» Г. Юрчанкі.

Выдаём мы некалькі манаграфій і даследаванняў па пытаннях літаратуры. Сярод іх кнігі — «Аб мастацкай дэталі» А. Гардзіцкага, «Беларуская дзіцячая літаратура (1917—1967)» Э. Гурэвіч, «Фальклорныя матывы ў драматургіі Янкі Купалы» А. Макарэвіча, «Этнаграфічная спадчына Якуба Коласа» Э. Сабаленка, «Беларуская народная сатырычная проза» А. Фядосіка, «Беларускія летапісы як літаратурны помнік» В. Чамярыцкага, «Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі» М. Грынчыка, другі том «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры», зборнік матэрыялаў аб жыцці і творчасці Янкі Купалы пад назвай «Пясняр народных дум».

Вучоным, выкладчыкам, настаўнікам і студэнтам, тым, хто цікавіцца вусна-паэтычнай творчасцю нашага народа, адрасуюцца кнігі «Песенны рэпертуар сучаснай беларускай вёскі» М. Гвоздзева, «Ад традыцыйнага фальклору да рэвалюцыйнай паэзіі» К. Кабашнікава, зборнік даследаванняў «Праблемы сучаснага беларускага фальклору».

Рад кніг атрымае наш чытач па пытаннях гісторыі і развіцця беларускага мастацтва. В. Ялатаў у кнізе «Меладычныя асновы беларускай народнай музыкі» даследуе асноўныя заканамернасці і найбольш тыповыя тэндэнцыі ў меладычным развіцці народнай музыкі беларусаў; І. Ялатамцава ў манаграфіі «Манументальны летапіс эпохі» прасочвае, як за гады Савецкай улады склалася школа беларускай скульптуры; А. Лабовіч у кнізе «Тэатр барацьбы» раскрывае малавядомыя старонкі дзейнасці тэатральных гурткоў у былой Заходняй Беларусі. Будуць выдадзены таксама кнігі «Дэкарацыйнае мастацтва музычнага тэатра БССР» П. Карнача, «Выяўленчае мастацтва Беларусі дакастрычніцкага перыяду» М. Кацара, «Старадаўні беларускі народны тэатр» С. Міско, «Беларускі народнасцэнічны танец» Ю. Чурко.

Упершыню выдаём мы сёлета асобнай кнігай «Прадмовы і пасляслоўі» Францішка Скарыны — ярчэйшыя старонкі ў гісторыі развіцця беларускай нацыянальнай культуры.

У серыі навукова-папулярных брашур выйдуць у гэтым годзе нарысы «Уладзіслаў Галубок» А. Атрошчанкі і «П. А. Бузук» Я. Рамановіча і А. Юрэвіч.

У 1966 годзе мы выдалі кнігу М. Бірылы «Беларуская антрапанімія». Сёлета выходзіць у свет другая частка гэтай работы, у якой разглядаецца этымалогія прозвішчаўтваральных асноў і структура 20 тысяч сучасных беларускіх прозвішчаў.

З грыфам нашага выдавецтва выйдуць таксама кнігі па пытаннях мовазнаўства (такія кнігі, ў прыватнасці, як «Беларуска-ўкраінскія пісьмова-моўныя сувязі» В. Анічэнкі, «Беларуская айканімія. Лінгвістычны аналіз назваў населеных пунктаў Мінскай вобласці» В. Лемцюговай, «Фаналагічная сістэма беларускай літаратурнай мовы» А. Падлужнага).

Вось коратка пра тыя нашы выданні сёлетняга года, якія на нашу думку, могуць зацікавіць чытачоў газеты «Літаратура і мастацтва». Назваў я тут, вядома, далёка не ўсё. Бо і сярод кніг па іншых галінах навукі ёсць нямала такіх, якія адрасуюцца не толькі спецыялістам.

Таму, у заключэнне, хочацца адаслаць чытачоў да нашых тэматычных планаў, якія ёсць ва ўсіх кніжных магазінах рэспублікі, — па іх яны змогуць дэталёва пазнаёміцца з усімі нашымі выданнямі.

СВЕТ ЧЫТАЕ ЛЕНІНА

Паводле дадзеных ЮНЕСКО, творы У. І. Леніна займаюць зараз першае месца ў свеце сярод перакладной літаратуры.

Мільёны людзей на ўсіх кантынентах зямлі вывучаюць Леніна, імкнуцца даведацца, як яго ідэі служаць вялікім пераўтварэнням, якія адбываюцца ў СССР і ў іншых краінах, што сталі на шлях будаўніцтва новага грамадства. Усходы кнігі Уладзіміра Ільіча знаходзяць чытачоў, іх пастаянна пытаюць у магазінах.

Пяць гадоў назад японскае выдавецтва «Оцукі-сётэн» выпусціла Поўны збор твораў У. І. Леніна тыражом у 135 тысяч экземпляраў. А зараз агульны яго тыраж дасягнуў 1 037 500 экземпляраў. Цікавасць да прац Леніна ў Японіі працягвае расці. Да стагадовага юбілею з дня яго нараджэння «Оцукі-сётэн» прадпрымае пятае дапоўненае выданне. Апрача таго, выдаецца шасцітомнік выбраных ленінскіх твораў.

Аб гэтым мне расказаў старшыня Усесаюзнага аб'яднання «Міжнародная кніга» Барыс Макараў, які нядаўна вярнуўся з Японіі. Ён паведаміў, мяне з тамі «Оцукі-сётэн», «Мэйдзітосё», «Саніці-сёбо» і іншых выдавецтваў, якія ў сувязі са стагоддзем з дня нараджэння У. І. Леніна выпускаюць дзесяткі назваў ленінскіх прац, а таксама ўспамінаў пра яго таварышаў, паплечнікаў, яго родных; мастацкія творы, прысвечаныя вялікаму правадыру. «Камітэт садзеяння перакладам і выданням савецкіх кніг у Японіі», у які ўваходзіць 60 буйнейшых выдавецтваў, мяркуе выпусціць каталог усіх кніг Ленініяны, выдадзеных у краіне.

Японія — характэрны прыклад калясальнай папулярнасці, якой карыстаюцца працы Леніна за рубяжом.

Вялікую цікавасць да кніг Леніна праяўляе грамадскасць Індыі. Там выйшлі ўсе капітальныя працы і важнейшыя артыкулы Уладзіміра Ільіча. Тыражы і тут мільённыя. У лістападзе ў Маскву прыязджаў уладальнік выдавецтва «Карэнт Букс» М. Томас. Ён вёў перагаворы з аб'яднаннем «Міжнародная кніга» аб выпуску ў Індыі вялікага зборніка ленінскіх работ па аграрным пытанні.

— Гэтыя творы, — сказаў ён, — карыстаюцца ў нас зараз павышаным попытам. Я спадзяюся выдаць іх у 1969 годзе.

Асабліва хутка раскупляюцца ў краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі працы Леніна «Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме», «Дзяржава і рэвалюцыя», «Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму», «Аб моладзі», зборнік «Аб культуры і культурнай рэвалюцыі», артыкулы, прысвечаныя жаночаму пытанню.

Сусветны кніжны рынак у нашы дні няммыслімы без прац Леніна. У Лацінскай Амерыцы іх выпускае галоўным чынам аргенцінскае выдавецтва «Картага». Там выйшаў збор твораў У. І. Леніна па чацвёртым савецкім выданні ў сарака трох тамах. Нядаўна яно папоўнілася яшчэ двума тамамі. Сярэдні тэрмін рэалізацыі гэтага збору твораў не перавышае паўтара-двух гадоў.

Кнігі Леніна выпускаюць выдавецтвы і іншых краін Лацінскай Амерыкі: Бразіліі, Чылі, Уругвая, Калумбіі. Уругвайскае «Эдзісіонес Пуэблас Унідас», вядомае публікацыямі капітальных прац па марксісцка-ленінскай філасофіі, упершыню ў Лацінскай Амерыцы выпускае поўную біяграфію Уладзіміра Ільіча.

Да ленінскага юбілею ў Францыі, Англіі, Галандыі, Даніі выйдуць юбілейныя выданні твораў заснавальніка Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы. Італьянскае выдавецтва «Эдзіторы рыуніці» ў дадатак да выпушчанага ў мінулым годзе трыццаціпяцітомнага «Збору твораў У. І. Леніна» рыхтуе яшчэ дзесяць тамоў.

Найбольшая колькасць кніг, прысвечаных ленінскай тэме, выйдзе да знамянальнай даты ў сацыялістычных краінах. Буйнымі тыражамі іх будуць выдадзены ў Венгрыі, ГДР, Чэхаславакіі, Балгарыі, Польшчы, Югаславіі, КНДР, Румыніі.

Некаторыя выданні ажыццяўляюцца сумесна. Так, польская «Аркады» і савецкі «Стройиздат» на рускай, польскай і англійскай мовах выпусцяць кнігу-альбом аб радзіме правадыра — Ульянаўску.

У Савецкім Саюзе да ленінскага юбілею выдадуцца каля тысячы назваў кніг, брашур, альбомаў. Многія з іх па просьбе зарубежных кнігагандлёвых фірм перакладаюцца на замежныя мовы. Усесаюзнае аб'яднанне «Міжнародная кніга» ўжо атрымала і працягвае атрымліваць з розных краін свету шматлікія заказы на юбілейныя выданні.

Алег МАРСКОЎ.
(АДН).

ЮБІЛЕЙНАЯ МАСТАЦКАЯ

УРАЖАННЯМІ ДЗЕЛЯЦЦА ГЛЕДАЧЫ



На выстаўку прыйшлі школьнікі.

Фота М. МІНКОВІЧА.

ПАМЯЦЬ

Міхась ГЕРЧЫК,
пісьменнік.

Я хадзіў па залах юбілейнай мастацкай выстаўкі і спыняўся то перад звонкай і чыстай чаканкай Б. Герлавана, якая нагадвае работы старадаўніх майстроў, то перад гарэзнымі, абаяльнымі ў сваёй непасрэднасці дзявочымі фігуркамі скульптурнай кампазіцыі У. Байцуна «Енька», то перад пяшчотнымі, празрыстымі, поўнымі святла і паветра акварэлямі А. Волкава, Ф. Гумена, Ю. Выхадцава, то перад маленькімі паэтычнымі пейзажамі К. Касмачова, якія скупа, але незвычайна тонка і задушэўна перадаюць усё хараство беларускай прыроды, то перад глыбока псіхалагічнымі партрэтамі І. Ахрэмчыка.

А потым я ўбачыў гэту жанчыну і пачаў пакутліва ўспамінаць, дзе я яе сустракаў. Яна глядзела на мяне з карціны Юзэфа Пучынскага «Памяць» (нават калі б не было на раме таблічкі з надпісам, усё роўна я здагадаўся б, як называецца палатно). Дык дзе ж я сустракаў гэтую жанчыну? Можа, каля брацкай магілы са скромным абеліскам і бляшанай зорачкай у глухой палескай вёсцы, можа, на Лагойшчыне, дзе зараз рэквіемам гучаць званы Хатыні, спаленай фашыстамі; а можа, пад Ружанамі, у старой сялянскай хаце,— мы сядзелі на лавачцы, і яна нягучна расказвала мне, заезджаму журналісту, пра сваю нялёгкую долю. Я бачыў гэты хударлявы маршчыністы твар, гэтыя журботна падабраныя губы і гладка зачэсаныя попельна-сівыя валасы, пасоленыя пражытымі гадамі і перажытымі нягодамі. І выцвілыя бякла-сінія вочы гэтыя, з чырвонымі жылкамі, з празрыстымі слязінкамі, застылымі ў куточках, бачыў я,—яны з надзеяй углядаліся ў свет, гэтыя вочы, нібы патрабавалі ад яго адказу на думы і спадзяванні свае. І рукі гэтыя бачыў я, і з тых даўніх часоў яны не згладзіліся ў маёй памяці,— вялікія, набрынялыя, перавітыя жыламі, што выпуклі на іх, з распухлымі суставамі, — многа і цяжка папрацавалі на сваім вяку гэтыя рукі. Яны сеялі і жалі, варылі і мылі бялізну, лашчылі мужа і няньчылі дзяцей... І як жа яна ганарылася мужам і сваімі сынамі, гэта жанчына-маці, і дзе яна толькі сілы ўзяла, каб блаславіць іх на бой за родную зямлю, на смяротны бой, з якога яны не вярнуліся... Не вярнуліся яны, толькі памяць аб іх жыве ў яе вачах, у яе сэрцы, і гэта памяць прывяла яе да кургана бяссмерця, які прыгаршчамі насыпаюць людзі — бясконцы і сумны паток людзей. І тоненькі дубок у яе руках раптам здаўся мне свечкай, запаленай на ветры ў памяць аб усіх, хто загінуў на вайне. Дрыготкае святло гэтай свечкі водбліскам лягло на яе вочы, высвеціўшы столькі непазбыўнага гора і душэўнай высакароднасці, што я доўга не мог адвесці ад іх сваіх вачэй.

Буйны пярэдні план адыгрывае асаблівае значэнне ў кампазіцыі карціны Пучынскага, ён засяроджвае ўвагу гледача на галоўным — на вобразе маці. Яна засланяе сабой усіх, толькі твары людзей ля падножжа яшчэ можна разгледзець: інваліда на мыліцы, ён нясе зямлю ў шапцы, прыціскаючы яе локцем, і як жа яму цяжка ісці; маладзенькага салдата з сяброўкай; рабочага хлопца... Ды і на іх пачынаеш глядзець потым, калі ўволю нагаворышся з маці, калі яе гора стане драбінкай тваёй душы. Астатнія — гэта наогул ледзь акрэсленыя сілуэты на фоне светлай вады,— яны ствараюць той запаволены рытм, у якім напісана ўсё палатно.

Скупы і стрыманы каларыт «Памяці», як скупы і стрыманы на знешнія праявы сапраўдны смутак. У ім пераважаюць цёмныя тоны, але яны, прынамсі, на мой погляд, не робяць палатно змрочным — можа, колер вады на заднім плане, які ўвабраў у сябе сінечу неба, прычына гэтага, можа, сонечныя блікі, што дрыжаць на ёй, а можа, празрыстасць асенняга паветра,— цяжка сказаць. А іншы каларыт быў бы, бадай, тут і недарэчы. (Я не спецыяліст-мастацтвазнаўца, і таму абмяжуюся толькі гэтымі заўвагамі пра культуру самога жывапісу ў палатне).

Калісьці Лесінг сказаў, што жывапіс пакідае свабоднае поле ўяўленню. Я глядзеў на карціну Пучынскага і думаў, што калі-небудзь ён абавязкова вырасце, маленечкі дубок, які маці прынесла на курган; ён вырасце і стане магутным дубам,— угледзьцеся ў вочы гэтай жанчыны, у яе рукі, і вы таксама ў гэта паверыце. З самой гушчыні народнага жыцця прыйшла яна на палатно, каб ніколі не гасла ў нас памяць аб тых, хто загінуў у баях з фашызмам за наша шчасце.

На юбілейнай мастацкай выстаўцы, на мой погляд, многа цікавых, напісаных у розных манерах работ, якія патрабуюць глыбокага асэнсавання і разбору. Гэта і «Партызанскае вяселле» М. Данцыга, і работы В. Грамыкі, В. Цвірко, М. Савіцкага, Я. Ціхановіча і многіх іншых жывапісцаў, графікаў, скульптараў. Ды вось стаіць у мяне перад вачыма звычайная зямная жанчына, нечым няўлоўна падобная на ўсіх нашых маці, якія перажылі вайну, і сказалася некалькі шчырых слоў толькі аб ёй.

СВЯТЛО ПРЫГОЖАГА

А. АСІНОЎСКІ,
інжынер.

Калі я знаёміўся з творамі, паказанымі на юбілейнай мастацкай выстаўцы «50 гадоў БССР і КПБ», мяне ўвесь час не пакідала адна, як мне здаецца, важная думка. Яна наштурхнула на такую аналогію. Многія непрывабныя рэчывы, як вядома з курса фізікі, здольныя раптоўна пераліваццa яркім рознакаляровым святлом, калі гэтыя рэчывы асвятліць ультрафіялетавымі або інфрачырвонымі праменнямі. Гэтак жа асвятляюцца змрочныя твары людзей, калі побач — хаця б адзін чалавек з жыццярадаснай усмешкай. Што ж датычыць жывапісу, дык фарбы на палатне толькі тады жывуць у сюжэце, калі яны асветлены выразнымі чалавечымі вобразамі. І глядач тады асвятляецца гэтым святлом, якое мы яшчэ называем словамі — пачуццё прыгожага.

Адны толькі «сімпатычныя» фарбы не здольныя стварыць адчуванне радасці, калі твары персанажаў на палатне — посныя. Іканапісна плоскія, аднастайна суровыя аблічча не могуць быць аднолькава прыдатнымі для адлюстравання ўсіх чалавечых перажыванняў, пачуццяў. Фарбы і формы самі па сабе, нават калі яны, паводле меркавання таго ці іншага мастака, у вышэйшай ступені сімвалічныя, не здольныя выдзеліць у карціне тое, чаго ў ёй няма. Да таго ж сімвалы ў мастацтве (як і ў матэматыцы) хутчэй узбагачаюць нас дакладнай інфармацыяй, чым узвышанымі пачуццямі.

Сапраўды, дзіўную акалічнасць заўважаеш, калі праходзіш па выстаўцы: нягледзячы на бясспрэчную разнастайнасць тэм, сюжэтаў, вобразаў, творчых почыркаў, карціны выклікаюць адчуванне аднастайнасці — можа таму, што на тварах персанажаў розных твораў рэдка калі сустрэнеш усмешку.

Зразумейце мяне правільна: я зусім не патрабую, каб усмешкі былі на тварах персанажаў у творах на трагічныя сюжэты. Я кажу пра тое, што ў большасці работ вельмі вузкі дыяпазон душэўнага стану як саміх персанажаў, так і аўтараў твораў. Твары вельмі многіх герояў карцін здаліся мне на дзіва аднолькавымі па выразе. Якаясьці цяжкая, нязграбная сур'ёзнасць настолькі перапоўніла палотны, што сам хутка пачынаеш адчуваць стомленасць.

Вось, напрыклад, карціны М. Савіцкага — «Пакаранне смерцю», «Рабочыя», «Хлябы». Абсалютна розныя па змесце творы! Ала на мяне яны робяць аднолькавае ўражанне. Чаму ва ўсіх трох (яшчэ раз падкрэслю — розных!) палотнах такія каменныя твары? Чаму такія універсальныя характарыстыкі? Рашучая сабранасць рабочых не можа быць раўназначнай мужнай адчужанасці прыгавораных да пакарання смерцю. І хіба не цяплеюць твары нават самых суровых па характары працаўнікоў, калі ў іх на далоні гарачы, толькі што выпечаны хлеб? Шчыльна сцятыя нямыя губы кажуць пра многае перад звярынай ашчэранасцю ката. Але яны ненатуральна маўчаць на тварах жанчын, якія крочаць урачыста і велічна.

А вось вялізнае палатно М. Данцыга «Партызанскае вяселле». Першае, што кідаецца тут у вочы, — гэта абутак. Вось, маўляў, у чым ішлі тады замуж!.. Суровыя твары партызан, суровая абстаноўка. Але пры ўсім пры тым гэта ж вяселле. Дзе ж у такім выпадку ўласцівая маладосці радасць? Хаця б на хвіліну. Радасць перадышкі паміж баямі.

Магла б несці радасць цікавая па задуме карціна Х. Ліўшыца «Гулянне ў Пільніцы». Тут маляўнічыя фарбы, цудоўны ўбор дзяўчыны на першым плане, прывабная пластыка яе фігуры. Вясковыя домікі пусціліся ў скокі. Але чаму такія невыразныя, нязначныя твары? Салдат, які быццам бы цягнецца да прыгажуні, што на першым плане, глядзіць чамусьці кудысьці ўбок і ў вачах яго—пустата. Перад карцінай доўга не затрымліваешся — становіцца сумна. Узнікае такое ўражанне, што нават самі фарбы блякнуць.

Здавалася б, усё ёсць у карціне І. Рэя «Дзяўчаты», — і багата святла, і хараство маладосці. Але дзяўчаты яўна пазіруюць. Не, мы не адчуваем, што гэта сяброўкі, што ў іх ёсць аб чым пагаварыць. Магчыма, іх скаванасць тлумачыцца сарамлівасцю натуршчыц перад мастаком. Але ж гэта карціна, а не эцюд.

У заключэнне мне хочацца сказаць, што перад нашымі мастакамі востра стаіць праблема нацыянальнай самабытнасці. Наўрад ці варта капіраваць прыёмы іканапісцаў — тое, што ў старажытных мастакоў было шчырым, цяпер выглядае проста манерным. А манернасць ніколі не спрыяла нараджэнню шэдэўраў.

НАВЕЯНА «СЛОВАМ»

К. ТАРАСАЎ,
інжынер

Пэўна, ні адзін твор айчыннай літаратуры не меў столькі даследавальнікаў і каментатараў, як старажытнае «Слова аб палку Ігаравым». Яно не раз прыцягвала да сябе і ўвагу мастакоў. Усім вядомы карціны В. Васняцова і В. Пярова, малюнкі М. Карамзіна і Д. Маора, дэкарацыі К. Каровіна і М. Рэрыха, ілюстрацыі У. Фаворскага і палехскія мініяцюры.

І вось на рэспубліканскай мастацкай выстаўцы «50 гадоў БССР і КПБ» мы бачым яшчэ адну спробу па-свойму інтэрпрэтаваць вобразы слаўтага твора — трыпціх маладога беларускага мастака Ю. Нікіфарава «Слова аб палку Ігаравым». Мастак выбраў тры вузлавыя эпізоды пахода: зацьменне сонца, крывавая сеча, плач Яраслаўны.

Кампазіцыя і колерны рытм трыпціха маюць некалькі планаў. Усе тры сюжэты розныя па настроі, кожны мае сваю галоўную тэму і дадатковыя, толькі ім уласцівыя падтэмы. Таму работа разлічана на доўгі разгляд, успрымаецца з цікавасцю. У ёй адчуваецца шматпланавасць і багацце самой паэмы.

Вось спыніліся воіны... У цёмную ноч ператварыўся ясны дзень... Пажухла трава, узмахнулі крыламі начныя птушкі, завылі дзікія звяры. Святым крыжам спрабуе абараніцца ад незразумелай і жудаснай з'явы стары воін, а за ім і больш маладыя з жахам глядзяць угору, на чорную пляму, што закрыла сонца...

У «Зацьменні» ва ўсім захавана мера — некалькі няясных твараў на другім плане і шышакі, ледзь бачныя ў змроку. Карычневаты, таямнічы каларыт, дакладнасць дэталяў. Выразная кампазіцыя. Добра перададзена атмасфера паэтычнай завязкі «Слова», атмасфера надыходзячай трагедыі.

Але навеяны «Зацьменнем» настрой мяняецца, калі пераводзіш позірк на галоўную частку трыпціха. Кампазіцыя яе даволі складаная. На першым плане мастак напісаў асілка, які ў запале сечы выклікае ворагаў на бойку. У дужай руцэ ён трымае простую сялянскую сякеру. Ён стомлены шматчасовай крывавай сечай, паранены. Але ў постаці яго столькі мужнасці, столькі рашучасці біцца да канца, што верыш — нават паверажаны, усё роўна ён будзе пераможцам. Міжволі прыгадваеш словы напалеонаўскага маршала Лефеўра, які сказаў пасля Барадзінскай бітвы: «Гэтых рускіх мала забіць, нават памершых іх трэба яшчэ паваліць». За частаколам коп'яў фігура «буй-тура» Усевалада з грозным пацямнелым у бітве тварам, а над усёй групай—баявая харонга з «Нерукатворным спасам»...

Але ў гэтай частцы трыпціха ёсць на маю думку, некаторыя недахопы, якія выцякаюць з залішняга захаплення мастаком фармальным вырашэннем тэмы. Паміж эпізодамі кампазіцыі відавочны сэнсавыя і маляўнічыя правалы. Не дае глыбокага эфекту і шырокі белы фон карціны. Ён не звязвае эпізоды кампазіцыі і таму выглядае штучным, надуманым. Чысціня яго пярэчыць трагічнасці другіх планаў кампазіцыі.

Страціла ад захаплення фармальнымі рашэннямі і апошняя частка трыпціха — «Плач». Я разумею мастака, яму трэба было ўраўнаважыць агульную кампазіцыю трыпціха. І таму ў парушэнне сюжэта і настрою паэмы ён піша эпізод плачу Яраслаўны так, быццам дзеянне адбываецца ноччу, але ж мы ведаем, што Яраслаўна звяртаецца да ветру, да Дняпра-славуціча, а потым да сонца, значыць, дзеянне адбываецца днём альбо ўранку... Мастак жа падмяніў сонца маладзіком, і настрой плачу, такім чынам, выглядае як чарадзейства, як размова з начнымі духамі.

І ўсё ж трэба аддаць належнае чыста жывапіснаму майстэрству аўтара, які здолеў знайсці трапяткі, ледзь серабрысты каларыт і дакладную кампазіцыю гэтай часткі трыпціха.

Трыпціх «Слова аб палку Ігаравым» хвалюе, выклікае роздум і сведчыць, што перад намі сапраўдны і вельмі цікавы мастак.

БАЛАДА ПРА ГЕРОЯЎ

Л. КРЫГЕЛЬ,
фармацэўт

Творы пра герояў Вялікай Айчыннай вайны ніколі не перастануць хваляваць. І кожнае новае палатно жывапісца пра абаронцаў радзімы — франтавікоў і партызан заўсёды прыцягвае ўвагу. Вось і на выстаўцы «50 гадоў БССР і КПБ» немагчыма прайсці раўнадушна каля «Партызанскага вяселля» М. Данцыга, «Балады пра бацьку Мінная» М. Савіцкага, «Партызанскай сям'і» Ф. Бараноўскага, «Балады пра апошнюю кулю» В. Грамыкі.

Апошняе з названых палотнаў не ўражвае памерамі або яркімі фарбамі. Але каля яго міжволі спыняешся надоўга. Кранае тая шчырасць пачуцця, з якой вядзе мастак расказ пра трагічны баявы эпізод.

...Іх двое, партызанаў. Ён і яна. Скончыліся патроны ў аўтамаце. Мужчына смяротна паранены. Жанчына расстраляла з пісталета ўсю абойму. Засталася апошняя куля... А ворагі набліжаюцца. Вось-вось адбудзецца трагічная развязка. Складаная гама пачуццяў на твары партызанкі. Яна вырашае, як распарадзіцца апошняй куляй—пусціць яе ў ворага, забіць яшчэ аднаго фашыста ці застрэліцца, каб не трапіць у палон?..

Так чытаецца карціна В. Грамыкі.

Тут усё падпарадкавана раскрыццю велічы подзвігу савецкіх людзей, нязломнасці іх у барацьбе з лютым ворагам, і што ўражвае асабліва, дык гэта ўмельства мастака скупымі, простымі выяўленчымі сродкамі дабіцца перадачы складанага пачуцця: на карціне—трагічнае, а ты, глядач, думаеш пра перамогу гэтых людзей, пра высакародную іх чысціню, пра тыя ідэалы, у імя якіх яны змагаюцца і перамагаюць.

Я стаяла ў роздуме каля гэтай карціны, няяркай па фарбах, стрыманай па жывапісе, вельмі сціплай, калі так можна сказаць, па выяўленчых сродках, і мне прыгадаўся чытаны калісьці паэтычны радок: «каб смерцю смерць перамагчы...» Мабыць ён выказвае часцінку таго пачуцця, якое выклікае гэтая карціна В. Грамыкі.

Кінуліся ў вочы і некаторыя недахопы ў карціне, але я не мастацтвазнаўца і не буду пра іх гаварыць. Скажу толькі, што ранейшае палатно В. Грамыкі, на якім была паказана сустрэча баявых пабрацімаў на месцы колішняга бою, мне здаецца, была больш дасканалай па перадачы твараў персанажаў, больш светлай па жывапісе. Мабыць, мастак павінен вярнуцца пасля выстаўкі да сваёй «Балады пра апошнюю кулю» і папрацаваць над вобразам партызанкі, над жывапісам гэтага хвалюючага палатна. Тады тыя высакародныя пачуцці, якія ў ім заключаны, будуць гучаць у сэрцы гледача яшчэ мацней.

ПАЭЗІЯ ПРОСТАГА

У. СІЛІЦКІ,
служачы.

Акварэлі Р. Ландарскага пазбаўлены чыста фармальных эфектаў. Тэмы іх — традыцыйныя: вечар, рака, прыгарад. Не выклікае асаблівага «здзіўлення» і «сакавіты» каларыт. Кампазіцыя іх таксама вельмі простая. Але нягледзячы на гэта, каля іх міжволі спыняешся. Работы вабяць спакойным, стрыманым, але вельмі паэтычным пачуццём, якое ўклаў у іх аўтар.


Вось першая работа—«Хутка Гомель». Ранняя вясна. Счарнелая мокрая шаша, уздоўж яе дрэвы. За імі калгасныя палі, яшчэ пакрытыя снегам. І апошняя «кропка» кампазіцыі — маленькі жоўты аўтобус... Уся гэтая немудрагелістая карціна не здаецца «дзяжурнай», ад яе, быццам ад прыглушанага, але мажорнага акорда, на душы робіцца хораша і радасна.

Увогуле, калі меркаваць па выстаўленых работах, творчасці Р. Ландарскага ўласцівы лірызм, філасофскі настрой. Гэта відавочна ў рабоце «Вечар». У гэтай камернай акварэлі мастак перадае ўрачыстую веліч лісцвянага лесу, асветленага заходзячым сонцам, настройвае на высокі лад роздуму аб прыродзе і чалавеку, аб сэнсе жыцця. «Залаты» лес як бы сімвалізуе прыгажосць і асэнсаванасць жыцця. Рабоце, можа, трохі шкодзіць некаторая незавершанасць, эскізнасць.

З трох работ Р. Ландарскага самай «акварэльнай», бадай, можна назваць «Рэчку Бесядзь». Тут акварэльная тэхніка дасягае высокага ўзроўню, а змест «Рэчкі» спачатку здаецца крыху нечаканым, ён носіць фантастычны характар. На лісце намалявана невялікая рачулка з прыбітай да берагу лодачкай. Глыбокі змрок, усё вакол сіняе, і толькі ў адным месцы на паверхні ракі свеціцца, нібы знутры, бела-ружовая пляма—адбітак высокага воблака, асветленага апошнімі промнямі сонца, якое ўжо схавалася за гарызонт. У заключэнне трэба адзначыць, што ў работах Р. Ландарскага мы адчуваем не толькі духоўную, але і этнаграфічную блізасць да роднай беларускай прыроды.



МАЛАНКА Ў ВАЧАХ



Яго не спыняюць на вуліцы, каб узяць аўтограф. Ён спакойна можа прайсці ў натоўпе — ніхто не скажа яму наўздагон: гэта ж «той самы» артыст. У яго выглядзе і ў паводзінах няма нічога акцёрскага.

А ён артыст, як кажуць, ад галавы да пят. Артыст з дзіцячых гадоў і да сённяшняга дня, калі засрэбрыліся валасы, выдаючы яго ўзрост.

Хлапчуком ён аднойчы пералез плот, за якім быў санаторый, трапіў на канцэрт заезджых эстраднікаў, здзівіўся той уладзе, якая дадзена песні і слову, і... і стаў артыстам. Кожны тыдзень з Казані ў Васільеўку завіталі гастралёры, і Паня штурмаваў санаторскі плот.

Першымі яго гледачамі былі бацькі і суседзі. «А ну, Паня, пакажы нам тых сабак!» — выхваляючыся сынам, клікаў яго бацька. І яшчэ не ведаючы, што «тыя сабакі»—героі байкі Крылова, Паня пачынаў асветніцка-артыстычную дзейнасць пад страхой роднай хаты. Толькі ён адзін ведаў, што выступае горш за тых артыстаў, ад якіх перайм маў і рэпертуар, і манеру выканання. Стары пячнік і вясковы паштальён, конюх з таго ж санаторыя і нават настаўніца гаварылі, стрымліваючы смех: «Артыст—Паня!..»

Праз многа гадоў пасля такога свайго дэбюту П. Кармунін іграў у спектаклі па рамане Мельнікава-Пячорскага «У лясах» па-свойму трагедыйную ролю Мікешкі. Працаваў над ёю пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Л. Літвінава, які тады перайшоў у Казанскі Вялікі драматычны тэатр імя В. І. Качалава. Іграў па чарзе з народным артыстам СССР Мікалаем Якушэнкам. На гастролях у Сочы адміністратары ў праграмах абавязкова ставілі птушку побач з прозвішчам вядомага ўсёй краіне акцёра, нават тады, калі на сцэне выступаў Кармунін. Гэта трохі крыўдзіла яго, хоць ён і разумеў адміністратарскія хітрыкі.

Аднойчы да яго ў грымуборную зайшоў «сам» Якушэнка і сказаў: «Ведаеш, Паня, іграй ты Мікешку адзін. У цябе атрымліваецца. Гледачы ў антракце кажуць: вось што значыць, калі іграе народны артыст...»— і пацінуў руку збянтэжанаму маладому таварышу.

Я нагадваю гэтыя выпадкі Паўлу Васільевічу, а ён неяк сарамліва спачатку, а потым нават злосна перапыняе мяне.

— Не, не тое гаворыш! Артыст... Бывае, мы лічым артыстам кожнага, хто ходзіць па сцэне. А я пакутую і зараз, калі ўспамінаю нешта зусім іншае. Тое, калі я не быў артыстам. Разумееш, якая гэта бяда—ты раптам адчуваеш сам, што не артыст?! Не артыст—дый годзе!.. Упершыню было яшчэ ў самадзейнасці. У «Навальніцы» іграў я Васю Кудраша, а тут, як на грэх, захварэў выканаўца ролі Барыса. «Ратуй!—просіць мяне. — Ты ж любога можаш паўтарыць». Добра, бяруся ратаваць. Рэжысёр нешта тлумачыць, «скразную дзею» вызначае, а я толькі адмахваюся: ды добра, зраблю ўсё на спектаклі. Пачаўся спектакль—як толькі скажу слова, у зале смяюцца. Устану ў позу закаханага—зноў... Збегчы хацеў, але акружылі мяне Кацярына, Дзікой, Ціхан, напраміле бог просяць дайграць. Дайграў. Зіма была лютая, але я адчыніў акно і з другога паверха сігануў на двор і збег ад сораму. З той пары на носе зарубіў: не, браце, артыст—не той, хто, не ведаючы броду, кідаецца ў ваду. Праца, праца цяжкая—наша мастацтва.

Павел Васільевіч глядзіць на мяне з дакорам, хваліцца, бо гэта, відаць, для яго вельмі важна—сэнс творчасці, якой аддадзена ўсё жыццё. «Труженик!»—паўтарае ён па-руску і ўспамінае, як яму, акцёру, які толькі што перайшоў з рускай сцэны ў трупу Беларускага тэатра, даручылі першую самастойную ролю ў камедыі «Я, бабуся, Іліко і Іларыён». Іграць грузіна па-беларуску — задача няпростая нават для карэннага купалаўца. І вось на першай рэпетыцыі П. Кармунін пачынае «за сталом» чытаць тэкст. Як не выбухнуў рогат, цяжка сказаць, але партнёры амаль адкрыта пацiскалі плячыма, усмешліва пераглядаліся, адводзілі вочы ад «артыста з Казані», якому такую высокую рэкамендацыю даваў Леў Літвінаў.

— Чытаў, як вучань першага класа. Перад вачыма літары — здаецца, чужыя мне: ну, ніяк не магу іх адолець. Рэжысёр супакойвае, а мне здаецца, быццам гэта толькі спачуванне. І крыўдна да слёз. Ужо тады, калі я іграў «уводы» ў старыя спектаклі, беларуская мова захапіла мяне сваёй мілагучнасцю. Дык што ж, здавацца і ехаць блукаць па тэатрах? Не, сказаў я самому сабе,—працуй! І пачаліся бяссонныя дні і ночы. Прыглядаюся да слова, смакую, нібы першую цёплую ад сонца суніцу ў чэрвені...

Здарылася так, што наступная рэпетыцыя адбылася праз пяць дзён. І купалаўцы былі ўзрушаны: Кармунін загаварыў—ды як! Быццам адкрывае для сябе хараство, якое само не ведае, што яно—хараство. І грузінскі акцэнт уносіў з такой далікатнасцю, нібы стараўся не засмеціць першароднае хараство беларускага слова. (Калі вы сёння слухаеце гэтага артыста на акадэмічнай сцэне або на блакітных экранах, наўрад ці ў вас не з'явіцца добрае пачуццё пашаны да таго, як шчодра і арганічна ўмее «жывапісаць» беларускім словам характары П. Кармунін!).

Колькі разоў, гледзячы на тое, што робіць на сцэне гэты акцёр, я параўноўваў яго эмацыянальны стан і манеру ігры з паляўнічым азартам—чалавек прабіваецца да мэты праз усе перашкоды, а слова яго—стрэл. Не раптоўны, ад выпадковага націску на курок, а той, якім завяршаецца пошук. Ён, гэты пошук, можа быць і напружана-кароткім, і разважлівым, але без яго П. Кармунін слова не вымавіць.

— Мабыць, гэта справядліва,—згаджаецца ён са мной.— Збоку яно заўсёды лепш бачыцца. Толькі мне, каб паслаць слова партнёру, патрэбны вочы... Разумееш, вочы, скажам Генадзя Гарбука, калі ён —Акцёр у «На дне». Мяне, бывае, аж скалане, як убачу, якія чыстыя слёзы абмываюць яго вочы. Майму Луку ўжо і не стрымацца, бо нельга не адказаць такім вачам—у іх надзея і вера асуджанага, нямое запытанне: няўжо нават перад ім яшчэ можа адкрыцца светлае жыццё?. І тады мой Лука гаворыць і ўсёй душой імкнецца падтрымаць гэтую надзею... Хораша іграецца з такім артыстам. З Віцем Тарасавым таксама лёгка гаварыць, спрачацца, канфліктаваць на сцэне, асабліва калі ён паглыбіцца ў вобраз так, што яго атоесамліваеш з Баронам ці з Канстанцінам Заслонавым...

Пакуль Павел Васільевіч перабірае ў памяці партнёраў, з якімі яму так лёгка перадаваць на сцэне «жыццё чалавечага духу», я ў думках вяртаюся ў тэатральную залу. Ідзе «Канстанцін Заслонаў». Антона Кроплю іграе П. Кармунін. Выступае ў каронпай ролі вялікага Глеба Паўлавіча Глебава. І мы, гледачы, не параўноўваем — лепш ці горш, вышэй ці ніжэй: для нас гэта зусім новы сцэнічны вобраз. («Ой, да чаго ж пакутліва адказна замяняць артыста, які застаецца для мяне асабіста богам, даруйце такое параўнанне»,—сказаў П. Кармунін). І вось што цікава. Калі на сцэне Заслонаў—Тарасаў, кармунінскі Кропля настолькі душэўны, што гэта, здаецца, яго мудрае сэрца дыктуе яму ўчынкі. Побач з М. Яроменкам, які іграе Заслонава больш стрымана, той жа Кропля ўспрымаецца насцярожаным і пільным, бо ўвесь час адчувае нейкую дыстанцыю паміж сабой і начальнікам... Розніца бывае ў нюансах сцэнічных паводзін П. Кармуніна, у інтанацыях голасу, у рэакцыях на сказанае і зробленае адным і другім выканаўцамі ролі Заслонава. Дзейснае слова артыста скіравана на непадобных партнёраў, перад ім кожны раз «новае вока», якому ён адрасуе свае жаданні, погляды, пачуцці,—і таму на розных прадстаўленнях «Канстанціна Заслонава» мы бачым і «таго ж», і «не таго» Кроплю.

— Самая вялікая перашкода для мяне—пустыя вочы партнёра. Бывае так: зірнеш у іх, а ён, бачыш, чакае, пакуль ты скончыш гаварыць, каб самому «падаваць» свой тэкст. Ну, тут хоць ты крыкам крычы! Пачынаеш тады шукаць іншыя прыстасаванні, каб нешта ў табе самім «загаварыла», а гэта цяжка. Можа, купалаўскі тэатр так і прыцягнуў мяне, што ансамбль у нас добры. І калі нешта табе не даецца, вінавацiш сябе. Хаця б той самы Лука...

Я гавару П. Кармуніну, што ўспрымаю гэты яго вобраз, як вобраз чалавека, які ведае ўсе бакі жыцця—і светлыя, і змрочныя, і ніхто ў начлежцы Кастылёва для яго не сакрэт, бачыў ён такіх. Але, як кожны букет палявых кветак здаецца яму новым, так і гэты букет людзей. І ён спрабуе дапамагчы кожнай з кветак раскрыцца непаўторнай сваёй красой, чалавечнасцю. Пераконваецца, што дарэмныя яго намаганні—і, апусціўшы рукі, адыходзіць.

Акцёр доўга маўчыць, а потым ківае галавой адмоўна.

— Апусціўшы рукі — гэта кепска, гэта «не тое»!.. Яшчэ шукаю я той унутраны маналог Лукі, дзе ён размаўляе сам з сабой, са сваім сумленнем, аргументуе, спрачаецца. Маўчыць—і мысліць. Бо нельга ж, разумееш, як Піліп з канапель, раптам ляпнуць у адрас Мядзведзева: «Вось у тым і бяда, міл чалавек, што не ўся зямля ў тваім участку памяшчаецца...» Чуеш, што ён разумее, аб чым яго душэўны клопат! Мысліцель, яму і з Львом Талстым ёсць пра што паспрачацца на роўных. І такі нібыта звычайны старэча, а раскусі, паспрабуй «зерне» яго характару! Вось і грызу, і грызу... Горкі! Я з яго герояў Ягора Булычова хацеў бы сыграць. Фактура ў мяне зусім не «булычоўская», ведаю. Але ж не фактура галоўнае— душу яго разумею, гэтую мяцежную, шырокую. І камень у яго на шыі таксама адчуваю. Калі б паспрабаваць...

Здагадваюся, што П. Кармунін узняў шлагбаум і ўпусціў мяне ў свае мары. Аказваецца, ён больш за дваццаць гадоў спадзяваўся, што сыграе Швандзю ў «Любові Яравой»—не адбылося. І пра Шэкспіра думае іншы раз трохі збянтэжана і лятуценна.

— Пра каго, як мяркуеш?— пытае ў мяне.

— Рычард Трэці,—адказваю, вось зараз убачыўшы нешта ў яго нечакана асветленых маланкамі ўнутранага незадавальнення сабой вачах.

— Ён!—усклікнуў Павел Васільевіч, і нібы вярнуўся з высокіх сфер «умственной беседы», як ён сказаў, на зямлю, па-дзіцячы насцярожана спытаўшы:—А ці здолею бы—вось пытанне? ...«Каня! Паўцарства за каня!»

А я ведаю, што вось гэтае «а ці здолею?» узнікае перад П. Кармуніным у кожнай ролі — і тады, калі Б. Эрын назваў яго Лукой у «На дне», і калі ў «Яшчэ раз пра любоў» яму даручылі эпізадычны выхад персанажа «Вартаўніка ў заапарку» (рэжысёр Б. Ганага лічыў гэтага акцёра самым надакучлівым, бо яму трэба было ведаць пра Вартаўніка літаральна «ўсё»: адкуль ён узяўся ў Маскве, чаму згадзіўся працаваць у заапарку, як успрымаюць яго службу блізкія і г. д., і г. д.). Яго творчасць, умоўна кажучы, і ёсць перааdоленне ў сабе гэтага «а ці здолею?» — лабараторыя артыста П. Кармуніна ў часе рэпетыцый і хатніх заняткаў ролю выглядае псіхалагічнымі доследамі, вынікам якіх бываюць сцэнічныя вобразы жыццёвай праўды і яркія па выяўленчых сродках.

Наўрад ці яму зусім чужое пачуццё "акцёрскага эгаізму"— прыемна, калі табе апладзіруюць сярод дзеі, калі цябе запамінаюць сярод іншых выканаўцаў, пра цябе пішуць не адзін абзац у рэцэнзіях. І гэты эгаізм ён умее пераадольваць, бо вышэйшыя мэты мастацтва яму даражэй за хутка вянучыя лаўры асабістага поспеху. Пабывайце ў тэатры, напрыклад, на «Людзях на балоце», і вы зноў пераканаецеся, як тактоўна ўпісваецца ў панараму вобразаў спектакля кармунінскі Чарнушка. Паглядзіце «У мяцеліцу» — вас радасна здзівіць тое, як яго Парфірый не замінае выказвацца Сцяпану Сыравараву, хоць становішча героя дае яму права сакавіта іграць «аўтаномна» ад партнёраў. Не баюся перабольшыць, назваўшы Іліко — Кармуніна маленькім сцэнічным шэдэўрам, але і ў гэтай камедыі акцёр жыве інтарэсамі агульнай пастаноўкі. Гэта тым больш зайздросная якасць мастака, што акцёр, які ніколі нідзе не вучыўся сістэматычна майстэрству, сам выхаваў у сабе высокія этычныя прынцыпы. Творчасць яго — паводзіны, за якія ён адказвае як чалавек і грамадзянін. Гэта зрабіла П. Кармуніна майстрам сцэны, які па праву ўвайшоў у ансамбль купалаўскага тэатра.

Барыс БУР'ЯН.

КОНКУРС НА ЛЕПШЫ МАСТАЦКІ ПЛАКАТ ПРА У. І. ЛЕНІНА І ПАРТЫЮ

Дзяржаўны Камітэт Савета Міністраў БССР па друку разам з Міністэрствам культуры БССР і Саюзам мастакоў БССР праводзяць рэспубліканскі конкурс на лепшы мастацкі плакат пра У. І. Леніна і Камуністычную партыю.

Мэта конкурсу — стварыць плакаты, выкананыя на высокім ідэйным і мастацкім узроўні, якія адлюстроўвалі б усёперамагаючую сілу ленінскіх ідэй, паспяховае ажыццяўленне планаў камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне, адзінства партыі і народа, братэрства і дружбу народаў СССР, непарушны саюз рабочых і сялян, веліч вобраза Уладзіміра Ільіча Леніна — правадыра і настаўніка працоўных, стваральніка Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы.

Для пераможцаў конкурсу ўстаноўлены адна першая прэмія (400 руб.), адна другая прэмія (300 руб.), адна трэцяя прэмія (200 руб.) і дзве заахвочвальныя прэміі па 100 рублёў.

Плакаты, якія прадстаўляюцца на конкурс, павінны мець высокія прафесіянальна-мастацкія вартасці і адпавядаць патрабаванням паліграфічнага выканання. Плакаты пасылаюцца ў журы конкурсу пад дэвізам. Конкурс праводзіцца з 15 студзеня па 15 чэрвеня 1969 года.

Зацверджана журы рэспубліканскага конкурсу на лепшы мастацкі плакат пра У. І. Леніна і Камуністычную партыю на чале з намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку А. Барушкам.

СЯРОД КНІГ

У ПАЛОНЕ ВЫПАДКОВАСЦЕЙ

ГАВОРКУ пра новую кнігу Міколы Гроднева «Вясна была...», у якой змешчаны аповесць «Нязведаная радасць» і шэсць апавяданняў, хочацца пачаць з апавядання «Анастасаўна». Яно не лепшае і не горшае ў кнізе, але, мне здаецца, найбольш характэрнае для творчай манеры пісьменніка. І асноўная калізія (каханне і звязаныя з ім перажыванні), і некаторыя кампазіцыйныя прыёмы і сюжэтныя павароты, і псіхалагічныя характарыстыкі персанажаў апавядання «Анастасаўна» паўтараюцца і ў многіх іншых творах зборніка. Але звернемся да самога апавядання.

«Неспакойна на сэрцы ў Алены... Пасля таго, як закончыла медыцынскі інстытут і прыехала працаваць участковым урачом дадому ў Лебядзёўку, мо дваццаць жаніхоў пачалі абіваць яе парог. З усіх хлопцаў яна выбрала аднаго — чарнявага вясёлуна Тараса Гаманюка.» І ўсё добра было ў маладых людзей, пакуль хлопец не загаварыў пра вяселле. «— От бы справіць яго на Новы год, — сказаў ён. Алена нібы ўзлавалася. Памаўчаўшы, яна прамовіла суха і абыякава, што падумае і праз колькі дзён скажа канчатковае слова». Праўда, якое канчатковае слова яна мелася сказаць, нам не ясна, бо тут жа «дадала, што яшчэ не збіраецца замуж».

Тарас, вядома, «пакутуе», ён жа «стукаў кулакамі ў грудзі і, не шкадуючы ласкавых слоў, угаворваў яе замуж...» І на табе — адмовіла. «Назаўтра Тарас падаў заяву старшыні праўлення, каб адпусціў яго з калгаса. А каб старшыня не здзіўляўся і не пярэчыў, Тарас пагутарыў з ім як мужчына з мужчынам. Расказаў пра сваю бяду: хоча забыцца на душэўны боль, а таму вырашыў паехаць хоць на самую цяжкую будоўлю ў Сібір».

Пасля «мужчынскай гутаркі» са старшынёй праўлення Тарас, як кажуць, сядзеў на чамадане. Але ў апошнюю хвіліну ўсё перайначылася. Ноччу ў хату да Алены стукае пенсіянер, былы міліцыянер Цімох Кацуба (аўтар лічыць патрэбным расказаць нам падрабязна яго біяграфію), які за працадні дзяжурыць па начах на пошце. Ён паведамляе, што ў суседняй вёсцы бяда — памірае дзіця. Патрэбна Аленіна дапамога. А на двары завіруха. «Алена Анастасаўна да болю прыкусіла губу і, апусціўшы рукі, моцна сціла кулакі. Хлопчык памірае...» Яна хутка сабралася і пайшла. «Трыццаць гадоў Цімох Кацуба служыў у міліцыі. Розныя былі здарэнні: у дождж, у навальніцу ішлі на заданне, а ў падобную завіруху не кожны начальнік пасылаў». Ён адгаворвае: «У такое надвор'е добры гаспадар сабаку з хаты не выганяе, а вам здаецца, жартачкі гэта!»

Алена ўсё ж ідзе ў Дубролеж. А следам за ёю назіркам ідзе Тарас. І там, ля пасцелі хворага хлопчыка, які выратаваны Аленай, шчасліва вырашаецца і лёс маладых.

Гэтая гісторыя, ужо сама па сабе, не вельмі цікавая. Як чытач мог заўважыць па нашым пераказе, не багата яна і псіхалагічным зместам. Хутчэй нават проста наіўная, жыццёва і літаратурна банальная.

Але значную частку апавядання «Анастасаўна» займае гісторыя, пра якую мы не сказалі. Як гэта характэрна для М. Гроднева, ён часта звяртаецца ў апавяданнях да перадгісторый персанажаў, каб вытлумачаць учынкі і паводзіны герояў. Так і тут. Чаму была адмовілася Алена выходзіць замуж за Тараса? Вядома, не таму, што «ў Тараса яшчэ не было асабістых заслуг. Ён і школу скончыў не з залатым медалём, і на флоце не зрабіў якога-небудзь подзвігу... У яго толькі пачалася працоўная біяграфія». Алена «кахала Тараса, прывыкла, як да роднага. Толькі калі ўяўляла, што ў яе раптам муж стане такім, які быў муж у яе маці, то адразу нечыя халодныя рукі няўмольна сціскалі горла, і ўсё замірала. Чула толькі, як па целу нібы мурашкі бегаюць».

Невядома, чаму Алена думае, што Тарас можа быць такім, як «муж у яе маці», гэта значыць, бацька Алены. Але аўтар у сувязі з гэтым падрабязна расказвае нам пра знелюдзенага хутаранца Пракопа — Аленінага бацьку. Магчыма, расказваць падрабязна пра жыццё Пракопа і ў сувязі з гэтым уводзіць у твор шэраг іншых персанажаў і не было патрэбы. Успаміны пра бацьку не маглі быць для Алены сур'ёзнай прычынай, каб адмовіцца ад кахання. Тым не менш, расказ пра бацьку Алены заслугоўвае большай увагі, чым гісторыя кахання маладых людзей.

Расказваючы нам пра дзяцінства Алены, пра яе бацьку і маці, пісьменнік выявіў уменне ўбачыць і перадаць жыццёвыя падзеі, стварыць больш-менш акрэслены чалавечы характар. Пісьменнік знайшоў дакладныя дэталі, каб паказаць зацятага ўласніка Пракопа, які ў гады вайны становіцца здраднікам. Мы бачым, як жыве ваўкалакам-адзінаасобнікам Пракоп на сваім хутары, пазбягаючы людзей, не ведаючы суседзяў. І людзі махнулі на Пракопа рукой: скнара, зайздроснік, дзікун. «Не звярталі на Пракопа ўвагі і немцы. Хадзіў ён у рыззі, зарослы чорнымі касмылямі. Мала таго, прыкінуўся, што дурнаваты: студзіў на халодную ваду, грэў пад пахай гарачую бульбіну. А то, бывала, улетку запражэ сані і паедзе ў лес па дровы, або ў калядныя маразы накляпае касу і шукае на вуліцы зялёнага лугу». За гэтай нібыта прыдуркаватасцю хавалася, аднак, хцівая воўчая натура. «Пракоп хоць іншы раз ротам глядзеў, задам наперад хадзіў, а таго не ведалі ў Лебядзёўцы, што ён ірваўся да ўлады, як кот да сала».

У гады вайны Пракоп пайшоў служыць немцам. Служыў ён ім старанна, усё хацеў выслужыцца, дагадзіць, а таму ўчыняў над вяскоўцамі шмат здзекаў і крыўд. Нават ягоная жонка Анастасся, ціхманая, прыбітая лёсам жанчына, зненавідзела яго і жадала яму «сабачай смерці». І Пракоп памёр-такі не па-чалавечы: сам жыў, як воўк, а загрызлі яго ваўкі пад санямі, у зімовым завейным полі.

Пісьменніку ўдалося стварыць запамінальны і выразны характар, пераканаўча паказаць, як ішоў Пракоп да свайго лагічнага канца, хоць, праўда, характар такі — не адкрыццё М. Гроднева. Але ж гэта, па сутнасці, самацэнная гісторыя ў апавяданні «Анастасаўна», стыхійная ўдача пісьменніка. Гісторыя пра Аленінага бацьку, як мы адзначалі, не звязана арганічна з асноўнай сюжэтнай лініяй твора.

Мы знарок так падрабязна спыніліся на апавяданні «Анастасаўна» таму, што ўсе яго недахопы чытач заўважыць і ў апавяданнях «Адзінокая», «Вясна была...», «Кватарант», «З выраю», «Пабыўка». І ў іх таксама занадта шмат выпадковых апісанняў (адны з іх больш, іншыя менш цікавыя ў мастацкіх адносінах, але, падкрэсліваем, яны ўсё ж выпадковыя), у іх такая ж беззмястоўнасць, беднасць псіхалагічных характарыстык галоўных персанажаў.

Чытаеш адно апавяданне, другое, трэцяе і не знаходзіш у іх жывых людзей, натуральных у сваіх пачуццях і паводзінах. Вось некалькі прыкладаў таго, як пісьменнік перадае пачуцці герояў.

«Суседства наша было і сапраўды добрае. Не таму, што раздзяляла нас шырма з посцілак. Я стараўся лішні раз нават не варухнуцца на сваім рыпучым ложку. Але аднойчы неяк я знарок цяжка ўздыхнуў. Потым кашлянуў, таксама знарок. І ў адказ толькі прашалясцела перагорнутая старонка кнігі. Што рабіць? Можа б хто адважыўся перакінуць калі шапку цераз шырманку — я не мог. А калі трэба было звярнуцца да Шуры, я ўзлікаўся, кашляў у кулак, чырванеў... Мы саромеліся адно аднаго» («Вясна была...»).

«Тэкля Адамаўна ад злосці збялела і толькі пагрозліва паківала пальцам:

— Не ўдасца табе, маланка, хвастом віляць, людзей каламуціць. А чаго ж ён другі год ходзіць? Скажы, скажы мне! — аж слінай пырскала яна. — Пакуль я буду на гэтым свеце, не дазволю табе людзей зводзіць! Свавольніца!

— Вучыцца мне трэба, а не замуж... А ён хоча — няхай жэніцца. Я тут пры чым?...» («Кватарант»).

Зрэшты, падобных мясцін можна было б працытаваць шмат. Хочацца падкрэсліць адно: пры дапамозе ўсіх гэтых «скаланула», «сціснецца сэрца», «анямела», «як учадзелая», «пабялела ў твары», «кідала ў ліхаманку», «ашчэрыўшы зубы» (усё гэта з розных апавяданняў) наўрад ці заглыбішся ў псіхалогію характараў.

Некалькі слоў пра змешчаную ў зборніку аповесць «Нязведаная радасць». У аснове аповесці гісторыя досыць вядомая. Маці без бацькі выгадавала сына. Ён ужо дарослы. Даводзіцца расказаць яму, хто ж яго бацька. Сын захацеў яго пабачыць. Сын застае бацьку хворым і адзінокім, пакараным за сваё былое легкадумства і безадказнасць. Сын яму так і гаворыць: «Я ішоў не толькі зірнуць на вас... Аднак не дачакаліся кары ад сына. Вас жыццё пакарала». І апроч гэтага вываду — «жыццё пакарала», да якога нас падводзіць аўтар, мы нічога не знаходзім у творы. Псіхалагічны ж і мастацкі ўзровень аповесці нічым не адрозніваецца ад астатніх твораў кнігі, пра якія мы гаварылі.

Ці было аўтару з чым выйсці да чытачоў? Такое пытанне напрошваецца пасля прачытання кнігі. Прынамсі, мы не знайшлі ў ёй твораў з уласным пісьменніцкім бачаннем і разуменнем жыцця, а толькі некалькі белетрызаваных выпадковых гісторый.

А. КАЛЕСНІК.

Мікола Гроднеў. «Вясна была...». Аповесць і апавяданні. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1968.

БЕЛАРУСКІЯ ТЭКСТЫ АРАБСКІМ ПІСЬМОМ

Вялікую цікавасць для беларускага мовазнаўства маюць беларускія тэксты, пісаныя арабскім пісьмом у другой палове XVII—XIX ст. ст. Перасяленцы-татары, якія ў XIV—XV стагоддзях аселі на тэрыторыі Беларусі і Літвы, засвоілі беларускую мову і шырока карысталіся ёю пісьмова. Хаця багаслужэнне ў іх спачатку вялося на арабскай, а потым на турэцкай мовах, значная частка мусульманскай рэлігійнай літаратуры была напісана па-беларуску, паколькі сваю родную мову многія татары не памяталі.

Дзякуючы гэтай акалічнасці захавалася значная колькасць напісаных арабскім пісьмом беларускіх тэкстаў, якія з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння гісторыі беларускай мовы.

Аднак, вывучэннем татарскай пісьмовасці на беларускай мове мовазнаўцы амаль не займаліся. Апрача некалькіх прац асобных даследчыкаў, якія ў розны час, пачынаючы з XIX стагоддзя, эпізадычна звярталіся да татарскай пісьмовасці, даследаванняў, якія б далі грунтоўнае ўяўленне аб гэтых тэкстах, да нядаўняга часу, на жаль, не было.

Вывучэннем беларускіх тэкстаў, пісаных арабскім пісьмом, у апошнія гады займаецца мовазнавец А. К. Антановіч, які жыве і працуе ў Вільнюсе. У выніку настойлівых і працяглых пошукаў яму ўдалося выявіць у бібліятэках, архівах і музеях, а таксама адшукаць у прыватных асоб дваццаць чатыры рукапісы (так званыя кітабы, хамаілы і інш.), якія адносяцца да XVII—XX стагоддзяў.

Асаблівую навуковую каштоўнасць для філолагаў-беларусістаў уяўляюць кітабы (па-арабску кітаб—кніга). У кітабах, якія змяшчалі паданні пра жыццё і дзейнасць Магамета і яго паплечнікаў, апісанні абрадаў, рытуалаў і звычаяў мусульман, а таксама маральна-дыдактычныя апавяданні і ўсходнія прыгодніцкія аповесці, значная частка тэкстаў напісаны па-беларуску і па-польску.

Пэўную цікавасць маюць і так званы хамаілы (ад арабскага: хамала—насіць)—зборы малітваў на арабскай і старажытна-турэцкай мовах. У хамаілах ёсць матэрыялы мусульманскай храналогіі, парады для лячэння хвароб, тлумачэнні сноў, прыкмет і г. д. У хамаілах беларускіх тэкстаў не шмат, але разам з кітабамі яны даюць цікавы матэрыял для даследчыкаў.

Вынікам карпатлівай даследчай работы па вывучэнні кітабаў і хамаілаў, праробленай А. Антановічам з'яўляецца яго манаграфія «Беларускія тэксты, пісаныя арабскім пісьмом, і іх графіка-арфаграфічная сістэма».

Гэта работа мае надзвычай важнае значэнне для вырашэння многіх пытанняў гісторыі беларускай мовы, гістарычнай дыялекталогіі, лексікалогіі, для высвятлення адносін старажытнай беларускай літаратурнай мовы да жывой народнай гаворкі і некаторых аспектаў беларуска-польскіх моўных адносін.

Манаграфія А. Антановіча складаецца з уводзін і двух раздзелаў.

Ва ўводзінах даследчык на падставе гістарычных крыніц і звестак вызначае час пасялення татар у Літве і Беларусі, геаграфію іх рассялення ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI—XVII стагоддзях, а таксама на тэрыторыі Беларусі ў пазнейшыя часы, разглядае ўмовы ўзнікнення першых беларускіх тэкстаў, адносіны іх да польскіх, дае сістэматызаваны агляд літаратуры, якая мае адносіны да татарскай пісьмовасці.

У першым раздзеле манаграфіі разглядаюцца ўсе вядомыя сёння рукапісныя зборнікі (кітабы, хамаілы і г. д.) XVII—XX стагоддзя, у якіх маюцца беларускія тэксты. Тут даецца агульная характарыстыка рукапісаў, апісваецца іх аб'ём і змест, паказваюцца характэрныя асаблівасці графіка-арфаграфічнай сістэмы і мовы тэкстаў, а таксама робіцца спроба вызначэння іх дыялектных асаблівасцей.

На падставе аналізу графічнай сістэмы даследаваных помнікаў аўтар робіць вывад, што тэксты, пісаныя арабскімі літарамі, вельмі блізкія да жывой народнай мовы і захавалі яе асаблівасці значна дакладней і паўней, чым вядомыя нам помнікі старажытнай беларускай мовы, пісаныя кірыліцай. Як характэрную асаблівасць правапісу тэкстаў XVII—XX стагоддзяў, пісаных арабскім пісьмом, А. Антановіч адзначае «паступовы пераход ад марфалагічнага да фанетычнага прынцыпу напісання слоў».

У другім раздзеле даследчык прасочвае эвалюцыю графіка-арфаграфічнай сістэмы арабскіх тэкстаў і працэс яе паступовага прыстасавання да беларускай гукавой сістэмы.

У кнізе разглядаецца таксама лексіка кітабаў. Назіранні вучонага даюць каштоўны матэрыял для вывучэння лексічнага складу беларускай мовы і яе лексічных нормаў.

Несумненна, даследаванне А. Антановіча ўяўляе цікавасць для шырокай навуковай грамадскасці і мае вялікае значэнне для беларускага мовазнаўства. Трэба спадзявацца, што вывучэнне беларускіх тэкстаў, пісаных арабскім пісьмом, будзе працягвацца і далей.

А. КАЎРУС.

А. Антановіч. «Беларускія тэксты, пісаныя арабскім пісьмом, і іх графіка-арфаграфічная сістэма». На рускай мове. Вільнюс, 1968. Выдавецтва Вільнюскага універсітэта.

З ЮБІЛЕЙНАЙ МАСТАЦКАЙ

І. ДАВІДОВІЧ. ГЕОРГІЙ СКАРЫНА (масла).

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За стварэнне шматсерыйнага тэлевізійнага фільма «Біяграфія маёй рэспублікі», які ярка адлюстраваў ратныя і працоўныя здзяйсненні беларускага народа за пяцьдзесят гадоў Савецкай улады і атрымаў высокую ацэнку ў гледача, Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў:

Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР: Александровіча Радаслава Андрэевіча —галоўнага рэдактара літаратурна-драматычнага вяшчання; Глухоўскага Рыгора Іванавіча — галоўнага рэдактара «Тэлефільма»; Засухіну Паліну Антонаўну — мантажора студыі «Беларусьфільм»; Карпілава Віктара Рыгоравіча — галоўнага рэжысёра літаратурна-драматычнага вяшчання; Калядэчка Веру Іванаўну — мантажора студыі «Беларусьфільм»; Недасеку Віталя Антонавіча — начальніка вытворчага аддзела; Рудамётава Ігара Аляксандравіча — намесніка галоўнага рэдактара «Тэлефільма»; Станкевіча Уладзіміра Дзмітравіча — галоўнага рэжысёра; Юрэвіча Мануіла Серафімавіча — галоўнага кінааператара; Ястрабава Арсена Дзмітравіча — кінарэжысёра.

Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР: Акімушкіна Вячаслава Дзмітравіча — дырэктара карціны; Байко Уладзіміра Аляксеевіча — старшага інжынера; Будзінскую Зінаіду Уладзіміраўну — старшага мантажора; Ільніцкага Уладзіміра Канстанцінавіча — устаноўшчыка святла і колеру; Клебановіча Міхаіла Іванавіча — рэдактара; Кочкіну Ніну Аляксандраўну — мантажніцу негатыва; Куліккоўскую Галіну Аляксандраўну—асістэнта рэжысёра; Рылькову Галіну Валянцінаўну — мантажніцу негатыва; Селяха Уладзіміра Міхайлавіча — праяўшчыка; Чаркас Зінаіду Канстанцінаўну — начальніка цэха.

■

За шматгадовую плённую работу ў партыйных і савецкіх органах і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР намеснік міністра культуры БССР Рыгор Гаўрылавіч Мачулін узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

АНАТОЛЬ ВЯЛЮГІН — ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

За заслугі ў развіцці беларускай савецкай літаратуры і дакументальнага кіно пісьменніку Вялюгіну Анатолю Сцяпанавічу прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры Беларускай ССР.

ФРАНЦЫЯ ПАМЯТАЕ

ДОМ НУМАР 4 па вуліцы Мары-Роз добра знаёмы многім жыхарам французскай сталіцы. Тут з 1908 года па 1912 год у эміграцыі жыў Уладзімір Ільіч Ленін. Гэтаму перыяду жыцця і дзейнасці правадыра сусветнага пралетарыяту прысвечана кніга французскага пісьменніка Ж. Фрэвіля «Ленін у Парыжы», выпушчаная нядаўна выдавецтвам «Эдзісьён Сосіаль». Створаная на аснове дакументальных крыніц і разам з тым высока мастацкая, кніга прысвячаецца 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

У адной з рэцэнзій на гэту работу Ж. Фрэвіля, апублікаванай у часопісе «Кайе дзю комюнізм», яе аўтар А. Воге адзначае, што даследаванне «Ленін у Парыжы» ўваскрашае ў памяці напружаную барацьбу У. І. Леніна супраць фальсіфікатараў марксізма, барацьбу за стварэнне сапраўды рэвалюцыйнай партыі. Увесь загранічны перыяд жыцця У. І. Леніна меў адну мэту—арганізаваць з-за мяжы рэвалюцыйную дзейнасць у Расіі, падрыхтаваць пралетарыят і партыю бальшавікоў да будучых баёў за пабудову новага грамадства.

Жыццё У. І. Леніна ў гэты перыяд надзвычай разнастайнае: правядзенне канферэнцый, сходаў, сустрэч, падрыхтоўка да выдання кніг, артыкулаў, шырокая перапіска. Пад яго кіраўніцтвам бальшавікі павялі рашучае наступленне на прадстаўнікоў розных ліквідатарскіх плыняў у партыі, супраць сектанцтва. Якраз у гэты перыяд бальшавікі праводзяць у Парыжы V Усерасійскую канферэнцыю РСДРП, якая вызначыла лозунгі і тактыку партыі ва ўмовах рэакцыі і асудзіла ліквідатарства. Да кастрычніка 1908 года адносіцца завяршэнне У. І. Леніным класічнай працы «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм». У 1911 годзе Уладзімір Ільіч заснаваў школу ў Ланжумо (прыгарад Парыжа), якая стала сапраўднай кузняй партыі бальшавікоў. Жан Фрэвіль прысвячае гэтай школе адзін з раздзелаў сваёй кнігі.

У. І. Ленін запомніўся працоўным Францыі не толькі як вялікі правадыр расійскага і сусветнага пралетарыяту, але і як вялікі чалавек. Яму падабалася бываць сярод простых людзей. Ён добра разумеў іх пачуцці, якія асабліва бурна праяўляліся ў час прадстаўленняў у народных тэатрах і дыскусій на выбарчых сходах. Ленін часта ўліваўся ў маніфестацыі і працэсіі, каб быць побач з працоўным людам Францыі. У 1908 годзе Уладзімір Ільіч разам з Надзеждай Канстанцінаўнай Крупскай прыняў удзел у дэманстрацыі пратэсту супраць пакарання смерцю іспанскага патрыёта Франсіска Ферэра.

Правадыр і настаўнік працоўных высока цаніў усё, што было звязана з Парыжскай камунай 1871 года. Яго часта можна было сустрэць на Манмартры або ля Сцяны Камунараў, на могілках Пер-Лашэз. Ён неаднойчы сустракаўся з кіраўнікамі рабочых, выступаў з публічнымі лекцыямі ў Вышэйшай школе сацыяльных даследаванняў, у якіх тлумачыў мэты рэвалюцыйнай барацьбы расійскага пралетарыяту. Ж. Фрэвіль апісвае цікавую сустрэчу У. І. Леніна з адным з арганізатараў французскай Рабочай партыі, блізкім сябрам і вучнем К. Маркса і Ф. Энгельса, актыўным прапагандыстам марксізма П. Лафаргам. Пазней, у 1916 годзе У. І. Ленін пісаў у адным з пісьмаў свайму саратніку-бальшавіку ў Парыж: «Я веру ў французскі рэвалюцыйны пралетарыят».

Як бы падводзячы вынікі дзейнасці У. І. Леніна ў Парыжы, Ж. Фрэвіль піша ў сваёй кнізе: «Ён (У. І. Ленін.—Рэд.) многа атрымаў ад Францыі, але яшчэ больш ён даў ёй. Францыя для яго гэта не толькі Парыж, але і дзейнасць, якую ён там разгарнуў, адважны і вынаходлівы народ, які ён тут пазнаў і які так цаніў яго прыветлівасць; гэта і рэвалюцыйнае мінулае вялікай рускай нацыі, і яе велізарны ўклад у здабытак усяго чалавецтва».

Рэцэнзенты кнігі Жана Фрэвіля аднадушна адзначаюць, што яна дазваляе чытачу ўзбагаціць свае веды, а таксама лепш зразумець актуальныя праблемы сучаснасці. Чытачы кнігі яшчэ выразней уявяць сабе, піша А. Воге, што «не толькі народ Расіі, але і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва павінна быць глыбока ўдзячна чалавеку, па праве названаму заснавальнікам першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы—Уладзіміру Ільічу Леніну».

Ю. БАБАЯНЦ, (ТАСС).

ПОСПЕХ КНІЖНАЙ ЛАТАРЭІ

Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па друку выпусціў у 1968 годзе білеты кніжнай латарэі на суму адзін мільён 46 тысяч рублёў. Білеты першага выпуску гэтай латарэі ахвотна набывалі кнігалюбы горада і вёскі нашай рэспублікі. Рэалізацыя іх у асноўным завершана.

Беларуская кніжная латарэя была багатая на «шчаслівыя» білеты. Той, хто выйграваў, набываў кнігі. Латарэя дапамагла прадаць на 898,5 тыс. рублёў палітычнай, мастацкай, тэхнічнай, сельскагаспадарчай літаратуры. Рэалізавана таксама нямала кніг мінулых гадоў выдання.

Продажам латарэйных білетаў займаліся работнікі дзяржаўнай кнігагандлёвай сеткі, спажывецкай кааперацыі, «Ваенкнігі» і «Саюздруку». Магазіны сістэмы Дзяржаўнага камітэта па друку прадалі білетаў на 572 тыс. рублёў, а на вёсцы—на 238 тыс. руб.

Найбольш паспяхова была арганізавана рэалізацыя латарэйных білетаў у магазінах Мінскага аблкнігагандлю (278 тыс. руб.), на другім месцы—Віцебскі і на трэцім — Гомельскі аблкнігагандлі Сярод сельскіх кааператараў лепш распаўсюджвалі білеты кніжнай латарэі работнікі Мінскага, Гомельскага і Брэсцкага аблспажыўсаюзаў.

Мяркуецца, што ў красавіку—маі гэтага года пачнецца распаўсюджванне білетаў другога выпуску Беларускай кніжнай латарэі.

ПА БЯДУЛЕЎСКІХ СЦЕЖКАХ

ПАСАДЗЕЦ — адна з самых аддаленых вёсак Лагойшчыны.

Бадай, ні аб адной з навакольных вёсак не захавалася столькі старадаўніх гісторый, этнаграфічных замалёвак, як аб Пасадцы. І данёс іх да нас Змітрок Бядуля, які тут нарадзіўся, правёў дзіцячыя і юнацкія гады. Велічная прырода і маленькія «хаткі бы скрынкі», што паўрасталі ў зямлю, цудоўныя казкі, легенды і стогны прыгнечанага люду, раскоша паноў і галеча сялян, якія «гінулі з голаду, нібы мухі», — усе гэтыя адкрыцці пісьменнік зрабіў тут, у родных мясцінах.

Нездарма ў аўтабіяграфіі Змітрок Бядуля пісаў: «Кожнае слова маё — шчыры ўспамін убогай вёскі. Кожны радок маёй песні — малюнак перажыванняў гаротнага, простага беларуса. Што датычыць фабульных крыніц, то ніводнае апавяданне ў мяне не прыдумана, у аснову паложаны сапраўдныя факты».

Як мне расказаў гады тры таму назад калгаснік Станіслаў Герка, нават літаратурны псеўданім пісьменніка — вынік калектыўнай творчасці пасадзецкіх юнакоў. «Памятаю, — успамінаў Герка, — Самуіл чытаў нам сваіх «Начлежнікаў». Зайшла гаворка, якім прозвішчам падпісаць твор. Гаварылі рознае: Бядняк, Бядак... Нарэшце спыніліся на Бядулі. А паколькі ў Пасадцы самага беднага чалавека звалі Змітраком, то і падпісалі — Змітрок Бядуля».

У допісе аб Пасадцы, змешчаным у «Нашай ніве» за 1910 год, Бядуля пісаў: «У нашай вёсцы ёсць колькі мужыцкіх і колькі яўрэйскіх хат, манаполька, вучылішча (хедар — прыватная пачатковая яўрэйская школа — **В. К.**). Апрача манапольки тут гандлююць гарэлкай усе, выцягваючы апошняе зерне з мужыцкай клеці. На нашых вёсках у найлепшыя гады мужыкам не хапала хлеба да новага. Бедната, цемната страшэнная, а сёлетнім летам беднату папраўляюць яшчэ частыя пажары. Надвор'е надта нягоднае: бульба памерзла, ярыну выпаліла, а жыта спее без пары». Вось тут і жывы! Прамыя публіцыстычныя выказванні З. Бядулі пераклікаюцца з яго мастацкімі творамі, у якіх прататыпамі з'яўляюцца рэальныя людзі — жыхары лясной, занядбанай вёскі.

Вось апавяданне «Пяць лыжак заціркі». Курная хаціна... Маці, пазычыўшы некалькі фунтаў мукі, гатуе заціркю. Якая радасць для дзяцей і яе мужа! З якой прагай «галодныя ваўчаняты» і гаспадар кідаюцца на страву. Але ў хату заходзіць суседка Сцёпчыха. Галодная, яна на традыцыйнае запрашэнне гаспадыні сесці за стол тут жа ўсаджваецца на лаву, бярэ лыжку і «ўплятае» заціркю. Кожная лыжка суседкі болем адбіваецца ў Антосі і яе дзецях.

Расказваючы пра гэтую трагедыю галоднай сям'і, пісьменнік зыходзіў з канкрэтнага факта. Яшчэ і цяпер жыве нявестка Сцёпчыхі калгасная пенсіянерка Марыя Кандратаўна Вайцяхоўская. Яна добра памятае, як яе свякруха Вольга Іосіфаўна «пасілкавалася» заціркай у Антося Сяліцкага.

— Ой, згубны быў час для беднага чалавека, — з болем у сэрцы гаварыла мне сямідзесяцігадовая Марыя Кандратаўна. — Успомніш — сэрца баліць...

Так, не з лёгкага жыцця Сцёпчыха «парушыла шчасце» галоднай сям'і. Не з дастатку прыйшоў да адчаю яе муж Сцяпан Рыгоравіч (апавяданне «Сцёпка»). Голад, галеча, прыніжанасць былі спрадвечнымі спадарожнікамі селяніна ў тыя часы. Зведала ўсё гэта ў маладосці і Марыя Кандратаўна з мужам. Толькі Савецкая ўлада паставіла іх на ногі.

Зойдзем да ўнукаў Сцёпчыхі. Першы з іх, якога па дзеду таксама назвалі Сцяпанам, працуе трактарыстам у сельгасарцелі імя Энгельса. Жыве ён каля школы. Як і ва ўсіх аднавяскоўцаў, у яго з надыходам вечара загараюцца лямпачкі Ільіча, чутна радыё, вечарам сям'я ўсаджваецца каля блакітнага экрана.

Гаспадара мы сустрэлі за працай. Разам з калгаснымі цеслярамі ён рубіў сабе новы дом. Не маленькі: восем на дзесяць!

— Цеснаватую хату адразу пасля вайны паставіў, — расказвае механізатар, — вырашыў зрубіць новы дом.

Жонка Сцяпана працуе на фельчарска-акушэрскім пункце. У іх — пяцёра дзяцей. Усе яны дагледжаны як мае быць. Трое з іх — Оля, Клава і Валерык — вучацца ў школе. Таня скончыла тэхнікум і працуе эканамістам у Барысаўскім раёне, а сын Фёдар — сувязіст. Бацька не нарадуецца дзецьмі: школьнікі прыносяць толькі чацвёркі і пяцёркі, а старэйшыя — падзякі за сумленную працу.

У канцы сяла, насупраць сельмага, жыве малодшы сын Вайцяхоўскай — Міхась. Ён таксама трактарыст. І хаця сям'я ў яго яшчэ большая, чым у брата, у доме дастатак. Тут ёсць, як кажуць, і скварка, і да скваркі.

Далёка ў нябыт адышлі тыя чорныя дні, калі чалавеку не было ходу ў жыцці. Даволі сказаць, што толькі за пасляваенныя гады мясцовую васьмігодку скончылі 260 юнакоў і дзяўчат, а атрымалі сярэднюю адукацыю 110 пасадчан. Многія скончылі вышэйшыя і спецыяльныя сярэднія навучальныя ўстановы.

НА ЎЗГОРКУ, між сосен, узвышаецца прыгожы новы будынак. У ім і кантора калгаса, і прасторны клуб. Далей — фельчарска-акушэрскі пункт, домікі, збудаваныя нядаўна для спецыялістаў сельгасарцелі. Шырокую брукаваную вуліцу абступаюць прасторныя дамы калгаснікаў.

Уверсе гудуць радыё- і электрычныя правады.

Мы ідзём па вуліцы з дырэктарам мясцовай васьмігодкі, заслужаным настаўнікам, парторгам калгаса Канстанцінам Сцяпанавічам Зянькевічам. Насустрач нам хутка крочыць яшчэ даволі маладая, з выразнымі рысамі твару жанчына. Прывітаўшыся, Канстанцін Сцяпанавіч на хвіліну запыніў яе, запытаў аб справах на ферме, а калі тая пайшла далей, сказаў:

— Даярка Ліда Сяліцкая, унучка той няшчаснай Марты, аб якой пісаў З. Бядуля ў аўтабіяграфічнай аповесці «У дрымучых лясах».

У маёй памяці раптоўна ўзнік той жахлівы эпізод, аб якім расказвае пісьменнік. Каб пракарміць галодных дзяцей, Марта зрабіла басаном дзесяць вогненных крокаў па напаленай цэгле! Шчэрыцца ад задавальнення вусаты твар ураднікa Ясінскага... Гэта ён, бязлітасны крывасмок, зрабіў на ўсё жыццё калекай жанчыну.

Не менш жорсткімі да сялян былі паны Ласкіх, Магдановічы, Чапкоўскія, якія пакінулі зусім без зямлі сялян. Бедната ішла парабкаваць да багатых, на лесараспрацоўкі да купцоў, а некаторыя ехалі шукаць шчасця за акіян.

У З. Бядулі ёсць апавяданне «Летапісцы», у якім дзядуля з унукам Андрэйкам пішуць ліст у Амерыку. Па дэталях, якія аўтар даў у творы, аднасяльчане ў адыходніку, што паехаў у ЗША, каб «нагрэбсці долараў», пазнаюць земляка Язэпа Вайду. Толькі не давялося ні дзеду, ні ўнуку атрымаць ад яго дапамогу. Язэп сам памёр з голаду, шукаючы работу.

Не аднаго яго напаткаў такі лёс. Некалькі гадоў перабіваўся там выпадковай працай Антон Сухадолаў. Але хутка і тую страціў. Выратаваўся толькі тым, што ў 1926 годзе вярнуўся на радзіму. «Шчаслўцамі» аказаліся Марыя Ленская і Іван Зінькевіч. Яны знайшлі ў Амерыцы сякі-такі прытулак. Але і іх пісьмы да родных былі поўныя суму і разгубленасці. Аднойчы Марыя даведалася, што яе сястра калгасніца Лізавета захварэла і доўгі час бясплатна лячылася ў бальніцы. Жанчына ніяк не магла ўцяміць, як гэта радавы чалавек мог столькі часу бясплатна лячыцца. «У нас бы на гэта не хапіла б заробку за некалькі год», — пісала яна. Скаргі на дарагоўлю жыцця, недаступнасць навукі для бедных, высокі кошт кватэр пастаянна выказваў у сваіх пісьмах і Іван да свайго брата калгасніка мясцовай арцелі Антона Зінькевіча.

У Змітрака Бядулі ёсць апавяданне «Умарыўся» — пра старога, спрацаванага чалавека ў царскія часы. «І жалеза з'ядае іржа. І камень не вечны. Адчуваю, што сілы мяне пакідаюць», — гаворыць стары Габрусь і ідзе жабраваць. Не аднаго бедака напаткаў такі лёс у тыя змрочныя часы. Мне расказвалі аб трагічным лёсе пасадзецкага дзеда Пятра Трайкоўскага, які, мабыць, і стаў прататыпам вобраза Габруся.

Цяпер у калгасе больш сотні састарэлых атрымліваюць пенсіі. Не так даўно калгаснікі праводзілі на заслужаны адпачынак ветэрана працы Васіля Уладзіміравіча Сабалеўскага. Колькі было выказана падзякі гэтаму чалавеку працы, пажаданняў доўгіх гадоў жыцця! І кім? Людзьмі, на першы погляд, чужымі, але такімі роднымі і блізкімі, як гэта і бывае ў адзінай дружнай калгаснай сям'і, дзе чалавек чалавеку — сябар...

В. КЛЕШЧАНКА, настаўнік.

Калгас імя Энгельса, Лагойскі раён.

КІНЕМАТАГРАФІЧНЫ ЛЁС «БРАТОЎ КАРАМАЗАВЫХ»

Вядомы савецкі кінарэжысёр Іван Пыр'еў, які дзесяць гадоў назад ажыццявіў кінапастаноўку рамана Фёдара Дастаеўскага «Ідыёт», экранізаваў ледзь не самы складаны раман у гісторыі сусветнай літаратуры — «Браты Карамазавы».

Гэта была апошняя работа вялікага майстра. Пыр'еў памёр на здымачнай пляцоўцы ад разрыву сэрца, пакінуўшы сваім пераемнікам тры самыя складаныя эпізоды, якія трэба было зняць. Пастаноўку завяршылі акцёры Міхаіл Ульянаў — выканаўца ролі Дзмітрыя Карамазава і Кірыл Лаўроў (Іван Карамазаў).

Трэба сказаць, што кінаверсіі Пыр'ева папярэднічалі яшчэ тры экранізацыі славутага рамана Дастаеўскага. У першыя гады гукавога кіно немцы першымі зрабілі спробу ўвасобіць на экране вобразы «Братоў Карамазавых». Паставіў фільм рэжысёр рускага паходжання Ф. Оцэп. У сорак сёмым годзе «Карамазавых» экранізаваў італьянскі рэжысёр Джакіліна.

У той час, калі Пыр'еў заканчваў работу над першай часткай «Ідыёта», па многіх экранах свету прайшлі «Браты Карамазавы» амерыканскага рэжысёра Р. Брукса і выклікалі на рэдкасць супярэчлівыя водгукі. Спрэчным здавалася літаральна ўсё — і імкненне рэжысёра завастрыць увагу на дэтэктыўным баку рамана, і «хэпі-энд», калі Дзмітрыю і Грушаньцы, якая прыехала ўслед, Іван дапамагае ўцячы з Сібіры ў Амерыку, і самі акцёры. Ролю Грушанькі выконвала заходнегерманская актрыса Марыя Шэл, а Дзмітрыя — Юл Брынер. Але так ці інакш гэты фільм пакінуў след у гісторыі экранізацый...

Карціна Івана Пыр'ева ідзе тры гадзіны сорак пяць мінут. І на працягу гэтага экраннага часу героі б'юцца над адным пытаннем — «Што такое існасць і ці ёсць яна наогул?» Глядач захоплены гэтымі цяжкімі пошукамі, бясконцымі падарожжамі герояў у самых сябе.

У інтэрв'ю, якое даў Іван Пыр'еў незадоўга да смерці, ён гаварыў:

— Пра «Карамазавых» я ўпершыню задумаўся, яшчэ калі ставіў «Ідыёта». Я адчуваю да Дастаеўскага даўнюю і стойкую прыхільнасць, як да пісьменніка выключна па мастацкай сіле і па трагічным лёсе. У яго раманах вельмі важна ўлавіць імкненне пісьменніка да светлага, чыстага маральнага пачатку ў чалавеку, а не акцэнтаваць увагу на хваравітых рысах яго творчасці. Для мяне самае галоўнае ў Дастаеўскім — вялікая любоў да Расіі, імкненне знайсці апору ў традыцыях дэмакратызму і народнасці і, вядома, яго страснае, усёпаглынаючае імкненне жыць. Таму галоўнае для нас — адлюстраваць філасофска-псіхалагічныя праблемы рамана, раскрыць «смердзякоўшчыну», «карамазаўшчыну», якія часам і цяпер праяўляюцца ў нашым жыцці. Змест рамана мы імкнёмся выказаць перш за ўсё праз унутранае жыццё яго асноўных герояў.

Гэтыя словы, думаецца, могуць стаць ключом да разумення рэжысёрскай трактоўкі фільма. Аўтары фільма засяродзілі ўвагу на канкрэтызацыі псіхалогіі герояў, якая часта абарочваецца анатоміяй характару. Пыр'еў паставіў сабе галоўнай задачай раскрыць тэму ўзаемаадносін паміж людзьмі, паказаць любоў Дастаеўскага да людзей, яго бязлітасную любоў да чалавека. Бязлітасную таму, што пісьменнік, паводле выказвання Сяргея Эйзенштэйна, ставіць сваіх герояў часам «у надзвычай ганебнае становішча».

Трэба сказаць, што ў фільме заняты пераважна акцёры з тэатраў. Праўда, многія з іх адначасова здымаюцца ў кіно: але ўсё ж іх прыхільнасць да сцэны ў іх пастаянная.

Дзмітрый Карамазаў у тэмпераментным выкананні вахтангаўца Міхаіла Ульянава — чалавек няўстрымных страсцей. Карамазаў — сын Карамазава, які ў той жа час захаваў чысціню сваёй душы, глыбіню пачуццяў, уласцівую людзям, што пакутуюць ад несправядлівасці, унутрана безабаронны.

Кірыл Лаўроў, акцёр Ленінградскага Вялікага драматычнага тэатра, цікава выканаў ролю Івана Карамазава; Фёдара Паўлавіча іграе адзін са старэйшых акцёраў МХАТа Марк Прудкін; Грушанька — актрыса тэатра імя Станіслаўскага Ліанэла Пыр'ева...

Калі памёр рэжысёр-пастаноўшчык, у фільме не было трох эпізодаў — «Мокрае», куды прыязджае Дзмітрый па Грушаньку, «Суд» і «Размова з чортам»... Міхаіл Ульянаў расказвае:

— Наша задача заключалася ў тым, каб завяршыць фільм у ключы, інтанацыйным ладзе, які быў узяты Пыр'евым. Мы падзялялі яго погляды на творчасць Дастаеўскага, на тое, якімі павінны быць Карамазавы на экране. Мне думаецца, што я ўлавіў асноўны прынцып канструкцыі вобраза. Дзмітрый — характар, які пазнае сябе знутры. Увесь вобраз грунтуецца ў рэзкім фартысіма, як і ўсе персанажы рамана. Героі ўзбуджаныя да крайнасці. У пачатку работы я, відаць, вельмі слепа прытрымліваўся рамарак Дастаеўскага, якія падкрэсліваюць звышнапружанне Дзмітрыя. А зараз тэмпераментам нікога не здзівіш. Важна знайсці дакладную прапорцыю паміж страсцямі героя, сваімі магчымасцямі і тым рашэннем, якое патрабуе драматургія фільма...

Каляровы шырокафарматны фільм «Браты Карамазавы» пачынае свой шлях да гледача. Можна пажадаць яму добрага лёсу.

Вячаслаў ХАТУЛЁЎ.
(АДН).

А ў народным тэатры юнага гледача Бялыніцкага раённага дома культуры зараз поўным ходам ідуць рэпетыцыі п'есы А. Арбузава «Далёкая дарога». Ставіць новы спектакль артыстка Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра Э. Міхайлава.

На здымку вы бачыце артыстаў-аматараў гэтага тэатра Віктара Курачэнку (злева), Мікалая Клімава і Святлану Маразевіч на рэпетыцыі.

Фота А. ГОЛЫША.

НЕРАСКРЫТЫЯ ТАЙНЫ

Гэта здарылася неўзабаве пасля другой сусветнай вайны ў 1946 годзе. Англійскія салдаты, якія неслі патрульную службу ў Аравіі, аднойчы ўбачылі ў пустыні маленькі статак газелей, а сярод іх хлопчыка. Меркаванне, што ён пасе жывёлу, выклікала сумненні, бо гэта былі не хатнія жывёлы—патруль быў у зусім дзікіх мясцінах, далёкіх ад населеных пунктаў.

Здзіўленыя салдаты накіравалі джып, спецыяльна прыстасаваны для працяглых пераездаў па пустыні, да дзівоснай групы. Пры набліжэнні аўтамашыны ўвесь статак на чале з «пастушком» кінуўся бегчы. Джып развіў хуткасць да 70—80 кіламетраў у гадзіну. На здзіўленне салдат хлопчык імчаўся, як віхор, не адстаючы ад чатырохногіх прыгажунь пустыні.

Ратуючыся ад праследвальнікаў, статак кідаўся з боку ўбок, рэзка паварочваў. Салдаты змучыліся, твары іх пакрыліся потам і пылам. І толькі пасля паўтара гадзін гонкі хлопчык, загнаны амаль насмерць, паваліўся ў пясок. Англічане акружылі яго і сталі з цікаўнасцю разглядаць. Газелі, рассыпаўшыся ў розныя бакі, таксама спыніліся, і здалёку назіралі за сваім «братам».

На Махамедзе, так назвалі хлопчыка англічане, не было ніякага адзення. Падэшвы яго ног пакрыліся карой, настолькі тоўстай і цвёрдай, што нагадвалі капыты. Дзякуючы гэтаму ён мог лёгка пераадольваць нават камяністыя прасторы пустыні. Махамеда звязалі і даставілі ў штаб. Ён не гаварыў і не разумеў таго, што гаварылі яму. Хлопчык еў толькі фінікі, карэнні раслін і розныя травы—тое, што елі газелі. Ён з задавальненнем піў малако з соскі, надзетай на бутэльку.

Англійскае ваеннае камандаванне зацікавілася хлопчыкам-газеллю. Вырашана было далучыць яго да цывілізацыі, а потым падрыхтаваць да ўдзелу ў Алімпійскіх гульнях, дзе ён, несумненна, пабіў бы ўсе сусветныя рэкорды па бегу. Аднак гэтым марам не суджана было збыцца. Страх перад людзьмі і сум па прыволлях пустыні зрабілі сваё. Махамед не пражыў у няволі і месяца. Разам са смерцю хлопчыка-газелі сышла ў магілу і тайна яго паходжання.

Да гэтага часу гаварылася пра дзяцей, якія жылі сярод ваўкоў. У Індыі і зараз ледзь не ў кожным паселішчы вам раскажуць гісторыю пра хлопчыкаў і дзяўчынак, «выхаваных» ваўкамі. Гэтыя легенды натхнілі Кіплінга, які напісаў свае вядомыя расказы пра Маўглі. Але гэта, так сказаць, даўняе. Да таго ж пісьменнік напісаў свой твор, грунтуючыся не на фактах і дакументах, а на народных легендах.

А вось рэчаіснасць нашых дзён. Як паведамляў мексіканскі часопіс «Сусесос», 20 красавіка 1967 года ў шпіталі Бальрампур у горадзе Лакнаў (Індыя) ва ўзросце 21 года памёр юнак Раму. Пасля яго смерці ў шпіталі была праведзена прэс-канферэнцыя, на якой прысутнічалі журналісты, урачы, біёлагі і антраполагі. Імя юнака абышло амаль усе газеты свету. Чым жа Раму прыцягнуў да сябе такую пільную ўвагу?

Гісторыя яго сапраўды незвычайная. Пятнаццаць гадоў назад, калі яму было ўсяго сем гадоў, хлопчыка знайшлі ў чаротавым кошыку на адной з чыгуначных станцый. Ён выў, рыкаў, вельмі хутка бегаў на чацвярэньках і піў ваду, хлебчучы. Цела падкідыша было пакрыта мноствам шрамаў ад воўчых укусаў. Хлопчыка назвалі Раму—у гонар маладога акцёра, які іграў галоўную ролю ў кінафільме, знятым па апавяданнях Кіплінга аб Маўглі.

Спробы вярнуць Раму ў чалавечае асяроддзе ўвянчаліся вельмі сціплымі поспехамі. Раму не разумеў ні слова, еў толькі сырое мяса, а ваду піў з чашкі, якая стаяла на падлозе. Удалося толькі прывучыць яго насіць кашулю. Адзіным праяўленнем «чалавечых» пачуццяў была радасць хлопчыка пры з'яўленні медсястры.

У 1952 годзе на адным з астравоў на поўдні Японіі мясцовыя жыхары знайшлі дзвюх дзяўчынак пятнаццаці і семнаццаці гадоў, якія жылі з чарадой малпаў. Удалося ўстанавіць паходжанне «японскіх тарзаначак», як іх назвалі. Бацька дзяўчынак, селянін, памёр, калі ім было пяць і сем гадоў. Дзяцей пад сваё апякунства і абарону ўзяла чарада малпаў. Як і іх «сёстры» па чарадзе, «тарзаначкі» маглі імгненна ўскарабкацца на вяршыню дрэва, спрытна скакалі з галінкі на галінку, харчаваліся дзікімі пладамі, карэннямі і насякомымі. Злавіць іх удалося з вялікай цяжкасцю.

Летась хлопчык-малпа быў злоўлены на поўначы Мазамбіка (партугальская калонія ў Афрыцы).

Загадкі дзяцей чалавека, якія выраслі ў акружэнні жывёл, даўно цікавяць вучоных. Нядаўна выйшла ў свет кніга французскага вучонага Люсьена Мэзона пад характэрным загалоўкам «Дзікія дзеці: міф і рэчаіснасць». У гэтай кнізе сабраны шматлікія легенды і гістарычныя дакументальныя матэрыялы аб дзецях, якія выраслі сярод звяроў.

В. ПАЛІКАРПАЎ.
(ТАСС).

ЗВОН МАЁЙ ЗЯМЛІ

Ці ШМАТ у Маскве беларускага? Памяркуйце самі: Беларускі вакзал, станцыя метро «Беларуская», вуліцы Брэсцкая, Мінская, завулак Нясвіжскі і іншыя, кінатэатр «Брэст», гасцініца «Мінск», рэстаран «Мінск» з вялікім выбарам беларускіх страў. Для аматараў беларускай кнігі — кнігарня № 106 па вуліцы Кірава з багацейшым беларускім аддзелам. Я нават пазайздросціў, што ў Маскве большы выбар беларускай кнігі, чым у Маладзечна, і адразу навязаў сабе ладны пакунак.

А колькі матэрыялаў з Беларусі і аб Беларусі ў маскоўскіх архівах і музеях?

Праціскаюся ў гурце наведвальнікаў у Дзяржаўны гістарычны музей, што на Краснай плошчы. Тут заўсёды тлумна, экскурсіі за экскурсіямі. У першых залах, адведзеных для паказу старажытнай Русі, небагата матэрыялаў з зямель беларускіх. А ў аддзеле феадалізму ўсё часцей з'яўляюцца экспанаты «беларускага паходжання». Вось беларускія першадрукаваныя кнігі і партрэт іх творцы—Францішка Скарыны, збоку — друкарская дошка.

У 14-й зале экспануецца фрагмент «Беларускія сяляне» з абраза XVII стагоддзя. Малюнак вельмі цікавы з этнаграфічнага боку. У наступнай зале — сам абраз. Шмат тут і розных гравюр XVIII стагоддзя, якія расказваюць пра жорсткасць панавання феадалаў, — «Пакаранне селяніна бізуном на дыбе», «Вырыванне ноздраў», акварэлі «Начная лоўля рыбы з промнем у Беларусі» (24 зала) і «Бортніцтва ў яловым лесе паблізу Гродна». Для гісторыкаў вялікую каштоўнасць мае план Слуцка (XVIII ст.). Усе матэрыялы, якія датычаць Беларусі, цяжка пералічыць.

СПЯШАЮСЯ ў фонды музея.

Тут, прызнацца, разгубіўся: столькі слуцкіх паясоў! Такой багатай калекцыі я нават уявіць сабе не мог. Зіхацяць цуда-паясы—доўгія, шырокія, з сакавітым нацыянальным узорам. Слуцкае работы... У экспазіцыях музея іх параўнаўча мала, а тут...

— Колькі ж усіх паясоў у музеі? — спытаў я ў загадчыцы аддзела.

— Дакладна не ведаю, некалькі соцень...

Зноў здзіўляюся і захапляюся творамі беларускіх ткачоў. На многіх унізе стаяць меткі «S. F.», «Sluck fecit», што азначае «Слуцк зрабіў». Часам стаіць толькі «Sluck».

Дарэчы, большасць паясоў, якія паказаны ў вядомым альбоме «Слуцкія паясы», узяты з калекцыі гэтага музея. Прычым, браліся толькі самыя лепшыя ўзоры...

Я паднёс аддзелу ад імя нашага Мінскага абласнога краязнаўчага музея, які размяшчаецца ў Маладзечна, некалькі дарункаў, у тым ліку посцілку-перабіранку. Масквічы аддзячылі шчодра: падаравалі... слуцкі пояс! Бясцэнны дарунак.

Іду ў другі аддзел.

— Дык, значыць, вас цікавяць матэрыялы беларускай археалогіі? Многія з іх тэрытарыяльна не «прывязаны». Прыйдзецца прагледзець усе фондавыя кнігі паступленняў, а іх у нас шмат, —гаворыць навуковы супрацоўнік, які займаецца славянскай археалогіяй.

Прашу тыя кнігі, у якія запісваліся паступленні яшчэ ў дакастрычніцкі перыяд. Калі пачынаць, дык пачынаць спачатку.

Раскрываю першую кнігу, знаёмлюся з навуковымі пашпартамі на знаходкі, чытаю апісанні, разглядаю мініяцюрныя фатаграфіі прадметаў. Пад інвентарным нумарам 5125 значацца паступленні В. З. Завітневіча ад 1892 г., якія прывезены археолагам з Бабруйскага павета (Гаражкі, Віркова, Валасовічы, Ольса, Любанічы, Ясень). А вось прадметы са станцыі Вышкі, але гэта ўжо дарунак нейкага Ладыгіна. З таго ж Бабруйскага павета, а таксама з Ігуменскага захоўваюцца матэрыялы на імя вядомага беларускага этнографа М. А. Янчука (1859—1921). Н. П. Авенарыус здаў у музей знаходкі з Барысаўскага і Бельскага паветаў. Год паступлення — 1891...

Шмат каштоўных археалагічных матэрыялаў, асабліва цікавых упрыгожванняў, паступіла ад беларускага этнографа і археолага Е. Р. Раманава (1855—1922). Найбольш матэрыялаў прывёз гэты вучоны з Мсціслаўшчыны (в. Дубейкава). Цэлыя калекцыі складаюць яго знаходкі з розных гарадзішчаў, селішчаў, курганоў Дзісненскага і Люцынскага паветаў Віцебскай губерні. Пра Раманава пісалі больш як пра этнографа, але варта паўзірацца ў яго багатыя знаходкі матэрыяльнай культуры, як робіцца ясна, што гэта і добры, скрупулёзны археолаг.

75 гадоў назад Маскоўскаму музею ахвяравалі свае археалагічныя знаходкі Тышкевіч і Турбін з Лагойска. У калекцыі — рэчы хатняга ўжытку, жалезныя прылады працы, розныя ўпрыгожванні. Турбін перадаў музею і матэрыялы раскопак са старажытнага Заслаўя.

Нехта І. А. К. з Магілёўшчыны таксама здаў розныя прадметы быту. Матэрыялы раскопак здавалі А. А. Гурко з Аршанскага павета, В. І. Сізоў і В. К. Чарапанаў з Рагачоўскага павета, прафесар Шапялевіч з Гарадоцкага, Шукевіч з Лідскага, М. Ф. Пакроўскі са Свянцянскага, М. Ф. Кусцінскі з Вяліжа і са Старога Лепеля, а таксама іншыя археолагі і аматары. Матэрыялы паступалі амаль з усіх зямель, якія засяляюцца беларусамі. І гэта толькі да Кастрычніка. А колькі прывезена даследчыкамі ўжо ў наш час! І міжволі падумалася: калі б адкрылі ў нас свой этнаграфічны музей, колькі можна было б «пазычыць» матэрыялаў з фондаў Дзяржаўнага гістарычнага музея!

АДДЗЕЛ выяўленчага мастацтва — адзін са старэйшых у музеі, і, мусіць, самы багаты беларусістыкай. Вялікую этнаграфічную калекцыю складаюць рысункі, паштоўкі, карціны, фатаграфіі з паказам тыпаў беларусаў.

Пад нумарам 449 значыцца альбом Радзівілаў. Рэдкае і каштоўнае выданне. У ім змешчана 165 партрэтаў прадстаўнікоў роду Радзівілаў з 1346 па 1758 год.

Многія матэрыялы адлюстроўваюць падзеі вайны 1812 года на беларускай зямлі. Цікавыя работы французскага мастака Фабер дзю Фора, які ў якасці карэспандэнта пабываў з войскамі ў Беларусі. Спецыялісты па беларускай этнаграфіі маглі б знайсці ў работах мастака тыпы людзей, тыпы пабудоў паўночнай Беларусі.

М. П. Фёдараў, кадзецкі афіцэр, не быў прафесіянальным мастаком, але падзеі 1863 г., відавочцам якіх ён быў, навялі на думку адлюстраваць іх. У складзе 7-га стралковага палка, які накіравалі для падаўлення паўстання, ён пабываў у Беларусі.

Чыста беларускіх малюнкаў у Фёдарава няма, але ёсць такія, што маюць агульнаграмадскае гучанне. Вось карыкатура на архісатрапа Мураўёва. Яго партрэт прыбіты вялізным цвіком на слупе. Пад ім надпіс: «Сабачая кроў! Будзеш помніць!» На наш погляд, цікавым уяўляецца карандашны рысунак з натуры «Пакаранне трох паўстанцаў». Шкада толькі, што ад часу работа мастака паблякла, некаторыя дэталі сцёрліся. Пазнаць гістарычных асоб па малюнку амаль немагчыма. Усіх работ Фёдарава ў музеі 42, з іх 35 акварэляў і 6 выкананых алоўкам і тушшу. Паступілі яны сюды ў 1927 годзе з Ленінградскага антыкварнага магазіна.

Ёсць у фондах аддзела выяўленчага мастацтва шмат так званых польскіх альбомаў. Некаторыя паступілі ў 1930 годзе з Дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна, дзе яны значыліся, як экспанаты з мураўёўскага архіва.

З Марыяй Юр'еўнай Бараноўскай, старшым навуковым супрацоўнікам аддзела, пераглядваю гэтыя альбомы. Выцягваем адзін чорны, прадаўгаваты.

— Гэты самы загадкавы. Фатаграфіі не падпісаны, — кажа яна.

Марыя Юр'еўна мяркуе, што гэты альбом мог належаць вядомаму польскаму пісьменніку Юзэфу Крашэўскаму, бо на першай старонцы яго фотакартка. Усяго ж — 164 здымкі.

У другім альбоме многія фатаграфіі падпісаны. Яны раскладзены ў асноўным у рускім алфавітным парадку.

— Думаю, што ўсе яны пабывалі ў руках Мураўёва ці іншых жандараў, — выказвае думку М. Бараноўская.

Усіх здымкаў каля ста, адны людзі без цяжкасцей пазнаюцца, а некаторых асоб трэба ўстанаўліваць. Цікава, што ў альбоме змешчаны дзве розныя фатаграфіі Уладзіслава Сыракомлі (Л. Кандратовіча). Адна агульнавядомая, такую мы бачылі ў кнігах паэта і такую я бачыў на мемарыяльнай дошцы ў Нясвіжскім фарным касцёле. А другая, мне здаецца, вельмі рэдкая.

Трэці альбом мае 61 фатаграфію і толькі 21 пямечана, астатнія асобы не разгаданы. Чацвёрты альбом — у экспазіцыі. Побач з ім ляжаць фатаграфіі Кастуся Каліноўскага, С. Серакоўскага, Я. Дамброўскага, В. Врублеўскага, Б. Шварцэ. З альбома глядзяць Нарбут, Гадлеўскі, Вяльгорскі, Міленскі, ёсць калектыўны здымак (у цэнтры студэнт Маскоўскага універсітэта Б. Калышка, кіраўнік партыі Ковенскага павета) — фатаграфія рэвалюцыйнага гуртка Дамброўскага-Серакоўскага.

ЗА 85 ГАДОЎ свайго існавання Дзяржаўны гістарычны музей сабраў 3 млн. 652 тыс. экспанатаў. Сярод гэтай неацэннай масы каштоўнасцей, паўтараю, шмат беларускага. У фондах многа беларускіх першадрукаваных кніг, сярод іх радчэйшае выданне Сымона Буднага «Катэхізіс», кнігі Францішка Скарыны, Літоўскія статуты і іншыя нацыянальныя шэдэўры. А колькі тут пісьмовых крыніц, колькі цікавых прыватных архіваў, якія паступілі ў музей у розны час! Словам, скарбы неацэнныя, і трэба смялей ставіць іх на службу гуманітарных навук свайго народа.

Генадзь КАХАНОЎСКІ,
старшы навуковы супрацоўнік Мінскага абласнога краязнаўчага музея.
г. Маладзечна.

АЎТАР — ПРЫРОДА

СНЕЖНЫ ЧАЛАВЕК.

Фотаэцюд І. ШЫШКО.

Лютаўскі экран

«РАЗВЕДЧЫКІ»

Вытворчасць Кіеўскай кінастудыі імя Даўжэнкі. Аўтар сцэнарыя Яўгеній Анапрыенка, рэжысёры - пастаноўшчыкі Аляксей Швачко і Ігар Самберскі.

Падзеі ў гэтай шыракаэкраннай карціне адбываюцца ў канцы сорак чацвёртага і пачатку сорак пятага гадоў, калі савецкія войскі вялі ўпартыя баі за Будапешт. Фільм расказвае аб падрыхтоўцы і правядзенні надзвычай важнай разведвальнай аперацыі па абясшкоджванні мінных палёў Дуная, аб нараджэнні непарушнай савецка-венгерскай дружбы.

Галоўныя ролі ў фільме выконваюць артысты Іван Нікалайчук, Леанід Быкаў, Андрэй Сава, Аляксей Смірноў, Уладзімір Емяльянаў, Людміла Марчанка.

У ролі савецкага разведчыка Макаранкі—Леанід Быкаў.

«ДЗЕНЬ АНЁЛА»

На здымку. Сімона Валеры — арт. Н. Фацеева, Назымаў—арт. А. Азо.

Фільм створаны маладым рэжысёрам Станіславам Гаварухіным па Адэскай кінастудыі па матывах апавядання Барыса Жыткова «Механік Салерна».

...Прайшло два гады пасля рэвалюцыі 1905 года. Параход «Цесарэвіч» ішоў пад рускім флагам праз Атлантыку. Тры дні судна змагалася са штормам. Нарэшце, акіян супакоіўся. І раптам выяўляецца, што ў трумах гарыць бавоўна...

Карціна сцвярджае дабрату, мужнасць, непахіснасць волі.

У галоўных ролях здымаліся папулярныя кінаакцёры Іван Пераверзеў (капітан), Мікалай Кручкоў (старпам), Яўгеній Жарыкаў (Салін), Анатолій Азо (Назымаў), Наталля Фацеева (Сімона Валеры), Барыс Андрэеў (Грызлоў).

■

Будуць паказаны таксама мастацкія фільмы «Сіні маршрут» і «Яго універсітэты», новыя хранікальна-дакументальныя і навукова-папулярныя кінастужкі «Візіт дружбы ў Швецыю» (аб знаходжанні Старшыні Савета Міністраў СССР А. М. Касыгіна ў Швецыі), «Там, дзе гартавалася сталь» (пра жыццё некалькіх пакаленняў карчагінцаў з легендарнай Шапятоўкі), «Пагранічнікі» (пра адну з застаў паўднёвай граніцы СССР), «Друг салдата» (пра ваенна-патрыятычныя песні), «Поступ свабоды» (пра барацьбу народа Партугальскай Гвінеі за вызваленне сваёй краіны ад каланізатараў), «Што там пад намі?» (пра даследчыкаў, занятых вывучэннем унутранай будовы Зямлі) і іншыя. Пытанням выхавання дзяцей прысвечаны кінакарціны «Зарніца» і «Эстафета».

Многа цікавага раскажуць гледачам таксама каляровыя кінакарціны «Кветкі і насякомыя», «Амстэрдам».

Беларускія кінадакументалісты перадаюць на суд гледачоў новыя фільмы «Летапіс» (пра рэспубліканскую выстаўку дзіцячага малюнка) і «Паляванне са старым сабакам» (аб неабходнасці берагчы і памнажаць багацці прыроды).

■

З зарубежных мастацкіх кінастужак у лютым будуць дэманстравацца: карэйская — «Студэнты», польская—«Марыся і Напалеон», румынская — «Хто адчыніць дзверы?», арабская — «Бунтар у масцы», японская — «Маці і адзінаццаць дзяцей», французская — «Вялікія манеўры».

ТЭЛЕБАЧАННЕ

28 студзеня

Першая праграма. 9-10 — тэлебачанне — школе. Прыродазнаўства. 4-ы клас. «Пакарэнне паветра чалавекам». 16-55 — праграма перадач. 17-00 — тэлевізійныя навіны (М). 17-15 — для малышоў. «Казкі бабулі Арыны». 17-45—«Горад мужнасці». Перадача прысвячаецца 25-годдзю з дня вызвалення Ленінграда ад варожай блакады. 18-05 — «Панарама навін». 19-00 — «Хатняя вайна». Прэм'ера тэлевізійнага мастацкага фільма (Польшча). Трэцяя, чацвёртая, пятая серыі (М). 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15 —кінапанарама (М). 22-45 — «Навіны, каментарыі». Праграма перадач. 23-00 — для студэнтаў вну. «Вышэйшая матэматыка». II курс.

Другая праграма. 17-15 — «Аб'ектыў». Перадача для кінааматараў (М). 18-00 для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Выстаўка Бураціна» (М). 18-30 — для дзяцей. «Сто забаў на сушы і вадзе». Тэлевізійны фільм. 19-05 — «Масква, год 1917». Дакументальны фільм. 19-45 — «Возера лебядзінае». Музычны фільм. 20-30 — экран—завочнікам. Палітэканомія. «Планамернае развіццё сацыялістычнай эканомікі. Эканамічная роля сацыялістычнай дзяржавы». Лекцыя кандыдата эканамічных навук В. І. Дзем'яновіча. 21-00 — «Как мимолётное виденье...» Тэлевізійная пастаноўка.

29 студзеня

Першая праграма. 9-10 — тэлебачанне—школе. Біялогія. 10-ы клас. «Сінтэз бялка ў клетцы». 9-40 —«Чынгіз Айтматаў». Кінанарыс. 10-00 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — «Сімфонія, народжаная нанава». Тэлевізійны музычны фільм (М). 11-10 — «Здароўе» (М). 11-45 — для школьнікаў. «Сто задум двух сяброў» (М). 15-05 — праграма перадач. 15-10 — школьная фільматэка. «У горадзе «С». Мастацкі фільм. 17-00 — тэлевізійныя навіны (М). 17-15—для школьнікаў. «Вялікія фізікі свету». Майкл Фарадэй. 17-45 — «На музычнай хвалі». 18-00 — «Панарама навін». 18-30 — трыбуна прапагандыста. «З гісторыі красамоўства ў Расіі». 19-00 — А. Сакалова. «Хто гэты Дзізі Гілеспі». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля (М). 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15 — па вашых просьбах. «Да новых сустрэч!» Фільм-канцэрт. 22-00 — «Акцёры і ролі». Артыст Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы Павел Кармунін. 23-15 — «Навіны, каментарыі». Праграма перадач. 22-30—для студэнтаў вну. «Фізіка».

Другая праграма. 17-15 — «Эстрадны калейдаскоп». Спявае «Арэра». Перадача з Тбілісі. 18-00—для школьнікаў «Жаваранак» (М). 18-30 — «Партыі радавы». Тэлевізійны нарыс. Перадача з Растована-Доне. 19-00 — чалавек і прырода. «Пейзажы маёй Палтаўшчыны». «Гатчынскі парк». Кінанарысы. 19-30 — «Будучыя чараўнікі». Тэлевізійны фільм. 20-15 — экран—завочнікам. Навуковы камунізм. «Найбольш важныя праблемы рабочага руху ў краінах капіталізму». Лекцыя кандыдата гістарычных навук М. Р. Круцько. 20-45 — экран — завочнікам. Палітэканомія. «Сутнасць агульнага крызісу капіталізму». Раскол свету на дзве грамадска-эканамічныя сістэмы і барацьба паміж імі». Лекцыя кандыдата эканамічных навук С. І. Губарэвіча. 21-15 — «Старонкі музычнага календара» (М). 21-45 — «Стандартызацыя і прагрэс» (М). 22-15 — у эфіры «Маладосць» (М).

30 студзеня.

Першая праграма. 16-45 — праграма перадач. 16-50 — тэлевізійныя навіны (М). 17-00 — для школьнікаў «Рэха» Тэлевізійны часопіс. 17-40 — за фасадам «свабоднага свету». «Праблемы адміністрацыі Ніксана». Гутарка каментатара У. Боўша. 18-00 — дзіцячы экран. «Чароўнае яйка». Лялечны фільм. 18-30 — «Панарама навін». 19-00 — «Вясна на Одэры». Мастацкі фільм. 20-40 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15 — «Навука, эканоміка, практыка». Тэлевізійная школа. Перадача першая. «Севазвароты ў рэспубліцы». 21-45 — «Песні барацьбы і гневу». Музычная перадача. 22-25 — «Я — з 60-х». Маладзёжная праграма. 23-30 — праграма перадач. 23-35—для студэнтаў вну. «Вышэйшая матэматыка». III курс.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск. вул. Захарава. 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25. адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53. аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62. аддзела публіцыстыкі — 3-22-04. аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04. выдавецтва — 6-25-19. бухгалтэрыі — 6-25-87

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 08228